ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

АЎТОРАК, 17 МАЯ 1938 г. № 27 (369)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ДАЦЬ ТВОРЫ, ВАРТЫЯ СТАЛІНСКАЙ ЭПОХІ

Зрабіць паварот да совецкай рэчаіснасці, стварыць кнігі аб барацьбе партыі і совецкага народа з наёмнікамі фашызма — трацкісцка-бухарынскімі, эсэраўскімі і нацыянал-фашысцкімі шпіёнамі, забойцамі і правакатарамі, выхоўваць здольную літаратурную моладзь—такія задачы паставіў перад пісьменнікамі Совецкай Беларусі в. а. сакратара ЦК КП(б)Б тав. Лявіцкі на адбыўшымся пленуме Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

Беларуская совецкая літаратура за апошні год мае велізарныя дасягненні. Пісьменнікі БССР, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі большэвікоў, ачышчаючы свае рады ад ворагаў народа, напісалі цэлы рад добрых і каштоўных твораў. Есць сярод іх і творы аб совецкай рэчаіснасці, але ўсё-ж работа беларускіх совецкіх пісьменнікаў, паэтаў і драматургаў у большай частцы абмежавана рамкамі гераічнага мінулага беларускага народа.

Адлюстраваць у сваіх творах велічнае жыццё нашых гарадоў і калгасаў, быт і баявую вучобу нашых чырвонаармейцаў і камандзіраў, пільнасць нашых чэкістаў, вартавых непарушных совецкіх граніц, — гэта свяшчэнны абавязак беларускіх совецкіх пісьменнікаў перад радзімай.

Асноўнымі прычынамі, перашкаджаючымі пісаць творы аб нашай совецкай рэчаіснасці, з'яўляліся да гэтага часу адарванасць некаторай часткі пісьменнікаў ад жыцця гарадоў і вёсак, адсутнасць у нашых пісьменнікаў ведання сучаснага жыцця беларускага совецкага народа, жыцця нашай доблеснай Чырвонай Арміі, нашых пагранічнікаў, адсутнасць палітыка-выхаваўчай работы сярод пісьменнікаў.

Народ — невычарпальная крыніца натхнення для майстроў мастацкага слова. Трэба акунуцца ў жыццё народа, у яго гераічныя справы, трэба трымаць з ім непарыўную сувязь.

Некаторыя старэйшыя майстры мастацкага слова некалькі разгубіліся і за апошні час мала далі шырокіх палотнаў аб гераізме і подвігах беларускага народа, аб яго ўрачыстасці і адданасці справе Леніна—Сталіна, справе соцыялізма.

Беларускія драматургі стварылі за апошні год цікавыя рэчы, але гэтага зусім недастаткова, таму што мала сярод гэтых твораў, твораў аб совецкай рэчаіснасці.

Праўда, у нашага народа гераічнае мінулае, але ў яго яшчэ больш гераічнае сучаснае. Гэта гераічнае сучаснае і павінна быць паказана ў п'есах беларускіх драматургаў. Гэта вельмі важна, важна тым больш, што мы павінны заваяваць права паказаць беларускае мастацтва ў Маскве. У шчыльным кантакце з акторскім і рэжысёрскім персаналам, з беларускімі совецкімі кампазітарамі драматургі могуць дасягнуць вельмі многага па ўзбагачэнню нашых тэатраў і кіно творамі, вартымі Сталінскай эпохі.

Магутны блок комуністаў і беспартыйных — сталінскі блок — павінен быць адлюстраван у мастацкіх творах беларускіх пісьменнікаў.

Новыя літаратурныя творы маладняка, творы невядомых да гэтага часу ў літаратуры людзей, прыём у члены Саюза совецкіх пісьменнікаў тт. Панчанкі і Кандрацені служаць яркім доказам таго, наколькі невычарпальны таленты ў нашай краіне, ставяць перад Саюзам пісьменнікаў і яго праўленнем задачу: сур'ёзна падыйсці да справы вырошчвання маладых пісьменнікаў, уважліва адносіцца да работы маладога аўтара, да яго рукапісу, штодзённа, штогадзінна дапамагаць людзям, якія робяць свае першыя крокі ў літаратуры.

Прайшоў даволі доўгі тэрмін з часу разгрому асноўных гнёздаў наймітаў міжнароднага фашызма, але за гэты час амаль не з'явілася крытычных артыкулаў, якія-б давалі новую ацэнку беларускай літаратуры, трактуючы яе ў святле нашай сучаснасці.

Безумоўна, што задача ацэнкі твораў беларускіх пісьменнікаў не з'яўляецца задачай толькі секцыі крытыкаў ССПБ, — гэта задача кожнага пісьменніка, задача Акадэміі навук БССР.

Не гледзячы на тое, што на пленуме было пастаўлена шмат творчых пытанняў, удзельнікі пленума не разгарнулі вакол іх шырокай большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі. Некаторыя з выступаўшых зводзілі свае выступленні да агульных разважанняў, нічога канкрэтнага аб творах, аб іх якасці і мастацкім майстэрстве не гаворачы.

Справаздачны даклад в. а. старшыні праўлення ССПБ тав. Лынькова быў недастаткова самакрытычным. Ен пералічыў дасягненні, закрануў дзе-якія недахопы ў рабоце праўлення, а шмат хвалюючых пытанняў літаратурнага жыцця абышоў бокам.

Пленум павінен паслужыць штуршком да напісання новых высокамастацкіх твораў аб велічы нашага народа, аб урачыстасці Сталінскай Канстытуцыі, аб перамогах нашай слаўнай комуністычнай партыі, нашага народа ў барацьбе з ворагамі, у пабудове соцыялізма ў СССР, твораў аб Чырвонай Арміі і аб соцыялістычнай радзіме, якая як непахісны ўцёс высіцца на адной шостай частцы зямлі.

В. а. старшыні ЦВК БССР тав. Наталевіч накіраваў увагу пісьменнікаў на тое, што іспытам у рабоце пісьменнікаў Совецкай Беларусі з'яўляецца ўдзел іх у перадвыбарчай кампаніі, у кампаніі падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

Ворагі яшчэ канчаткова не знішчаны і ад усіх сіл стараюцца перашкаджаць правядзенню падрыхтоўкі да выбараў. Задачай пісьменнікаў з'яўляецца—змагацца супроць варожых вылазак, прапагандыраваць Сталінскую Канстытуцыю і выбарчы закон сродкамі мастацкага слова. Трэба паказаць беларускаму народу тую вялікую розніцу, якая існуе паміж нашай і капіталістычнай выбарчай сістэмай, розніцу паміж совецкай і буржуазнай дэмакратыяй. У цікавых мастацкіх творах трэба расказаць аб тых велізарных дасягненнях, якіх дабілася Совецкая Беларусь і большэвіцкі ЦК партыі ў бязлітаснай барацьбе з ворагамі народа — трацкісцка-бухарынскімі і нацыянал-фашысцкімі шпіёнамі і дыверсантамі, наймітамі міжнароднага фашызма, расказаць аб лепшых людзях радзімы, бязмежна адданых партыі і народу, аб кандыдатах у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Гэта—першачарговая і пачэсная задача.

Беларускія паэты ўжо ўключыліся ў перадвыбарчую кампанію. Імі напісан цікавы калектыўны твор «Радзіме і правадыру». У ім простымі словамі расказана аб тым, што дала беларускаму народу Сталінская Канстытуцыя, як удзячны беларускі народ комуністычнай партыі і яе правадыру І. В. Сталіну.

Адзіным блокам комуністаў і беспартыйных пісьменнікаў, у дружнай творчай працы ліквідуем прабелы ў рабоце ССПБ. Дадзім творы, вартыя Сталінскай эпохі!

Пісьменнікі БССР—таварышу СТАЛІНУ

ДАРАГІ ІОСІФ ВІСАРЫЁНАВІЧ!

Пісьменнікі Совецкай Беларусі, сабраўшыся на пленум праўлення саюза, шлюць Вам, другу і настаўніку ўсёй совецкай літаратуры, сваё шчырае прывітанне.

Мы сабраліся, каб абмеркаваць рад творчых пытанняў, а таксама пытанне аб удзеле пісьменнікаў у выбарах у Вярхоўны Совет БССР. Гэтыя выбары, як і выбары ў Вярхоўны Совет СССР, ускалыхнулі ўвесь совецкі народ ад малога да вялікага. Беларускі народ—раней прыгнечаны і бяспраўны — атрымаў сваю дзяржаўнасць толькі ў выніку Кастрычніцкай рэволюцыі, дзякуючы дапамозе братніх народаў і, у першую чаргу, вялікага рускага народа. Выбары свайго першага соцыялістычнага парламента з'яўляюцца для нас вялікім трыумфам і святам. Беларускія совецкія пісьменнікі — плоць ад плоці і кроў ад крыві свайго народа. Яны не маюць большай радасці, чым радасць народа, не маюць іншых імкненняў і мэт, чым мэты і імкненні совецкага народа, іншых больш ганаровых абавязкаў, чым абавязак служыць вялікаму совецкаму народу. Пісьменнікі прыкладуць усе свае сілы, здольнасці, веды і майстэрства, каб сваім мастацкім словам удзельнічаць у рабоце нашай партыі па падрыхтоўцы і правядзенню выбараў у Вярхоўны Совет.

Ачыстка нашых радоў ад тройчы праклятых нацыянал-фашысцкіх і трацкісцка-бухарынскіх бандытаў, праведзеная пад кіраўніцтвам Нікалая Іванавіча Ежова — вернага сына радзімы і партыі, — аздаравіла атмасферу ў Саюзе пісьменнікаў і дала магчымасць плённай работы над новымі творамі, якія адлюстроўваюць і нашу эпоху і мінулае нашага народа. Барацьба супроць беларускіх нацыянал-фашыстаў, гэтых подлых лакеяў берлінскай служанкі — Польшчы і надалей застаецца нашай асноўнай задачай.

Наша Совецкая Беларусь мяжуе з фашысцкімі дзяржавамі на Захадзе, яна прыме на сябе першыя бaі з фашысцкімі агрэсарамі, калі яны нападуць на Совецкі Саюз, і дасць ім сакрушальны адпор. Пра небяспеку ваеннага нападу на нас, пра задачы абароны краіны мы ніколі не забываліся. І мы даем Вам, Іосіф Вісарыёнавіч, абяцанне яшчэ больш умацніць нашу работу па абароне краіны, трымаць у мабілізацыйнай гатоўнасці такую вострую зброю, якой з'яўляецца мастацкае слова.

Разам з усім народам Совецкай Беларусі нам хочацца яшчэ раз выказаць Вам, Іосіф Вісарыёнавіч, нашу бязмежна гарачую падзяку за пастаянныя клопаты аб Совецкай Беларусі, за сталінскую дружбу народаў, што забяспечыла росквіт і ўрачыстасць беларускай культуры — нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу.

Няхай жыве вялікая партыя Леніна—Сталіна!

Няхай жыве вялікі настаўнік, правадыр і бацька народаў Совецкага Саюза — Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

Таварышы І. В. Сталін і В. М. Молатаў далі згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Грузінскай ССР

1500 прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных Ленінскай выбарчай акругі № 1 гор. Тбілісі, сабраўшыся 9 мая на акруговую перадвыбарчую нараду звярнуліся да Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна з просьбай даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Грузінскай ССР па іх выбарчай акрузе.

11 мая атрымана паведамленне аб тым, што Іосіф Вісарыёнавіч Сталін выказаў сваю згоду балатыравацца па Ленінскай выбарчай акрузе.

Атрымана таксама паведамленне аб тым, што Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў выказаў сваю згоду балатыравацца па Сталінскай выбарчай акрузе № 8 гор. Тбілісі.

Пастановай акруговай выбарчай камісіі Ленінскай выбарчай акругі № 1 гор. Тбілісі кандыдатура таварыша Сталіна Іосіфа Вісарыёнавіча ўключана ў выбарчы бюлетэнь па Ленінскай выбарчай акрузе № 1 гор. Тбілісі.

Пастановай акруговай выбарчай камісіі Сталінскай выбарчай акругі № 8 гор. Тбілісі кандыдатура таварыша Молатава Вячэслава Міхайлавіча ўключана ў выбарчы бюлетэнь па Сталінскай выбарчай акрузе № 8 гор. Тбілісі.

Таварышы І. В. Сталін і А. І. Мікаян далі згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Армянскай ССР

Трохтысячны калектыў камбіната СК—«Совпрэн» імя С. М. Кірава паслаў таварышу Сталіну пісьмо з просьбай даць згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Армянскай ССР па выбарчай акрузе СК № 1 Сталінскага раёна гор. Ерэвана.

14 мая ўвечары выбаршчыкі атрымалі паведамленне аб згодзе таварыша Сталіна балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Армянскай ССР. Аднначасова выбаршчыкі Ерэванскага кансервнага завода атрымалі згоду намесніка старшыні Соўнаркома Саюза ССР тав. А. І. Мікаяна балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Армянскай ССР па Заводскай выбарчай акрузе № 9 гор. Ерэван.

Акруговая выбарчая камісія выбарчай акругі СК № 1 зарэгістравала кандыдатуру Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. Акруговая выбарчая камісія Заводскай выбарчай акругі зарэгістравала кандыдатуру А. І. Мікаяна.

Кандыдаты у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР

Усё новыя дзесяткі і сотні фабрык, заводаў, калгасаў, навуковых устаноў вылучаюць кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. З велізарным энтузіязмам праходзяць перадвыбарчыя сходы. Рабочыя, калгаснікі, працоўная інтэлігенцыя БССР яшчэ раз дэманструюць сваю любоў і адданасць большэвіцкай партыі і вялікаму правадыру народаў таварышу Сталіну

З вялікім уздымам прайшоў перадвыбарчы сход на менскім варштатабудаўнічым заводзе імя Варашылава. Адзін за другім выступаюць старэйшыя рабочыя завода, маладыя выбаршчыкі, інжынеры і вылучаюць кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. З пачуццём вялікай радасці сход аднадушна вылучае кандыдатамі таварышаў **Сталіна, Молатава, Варашылава, Кагановіча, Ежова, Калініна, Андрэева, Жданава, Касіора, Мікаяна, Чубара, А. А. Волкава, А. М. Лявіцкага, Б. Д. Бермана.**

З такім-жа уздымам і энтузіязмам прайшлі перадвыбарчыя сходы на радзе іншых прадпрыемстваў і ў сельсоветах.

Калектыў клімавіцкага сілікатнага завода вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварышоў **Сталіна, Молатава, Кагановіча, Калініна, Варашылава, Ежова, Касіора** і сакратара магілёўскага абкома партыі тав. **Рэпінскага.**

Калектыў менскай абутковай фабрыкі імя Тэльмана вылучыў кандыдатамі таварышоў **Сталіна, Молатава, Варашылава, Ежова, Мікаяна, Волкава** і **Наталевіча.**

Калгас «Перамога» Талачынскага местсовета — таварышаў **Сталіна, Молатава, Кагановіча, Варашылава, Ежова, А. А. Волкава, Б. Д. Бермана, А. Ф. Кавалёва, Н. Я. Наталевіча, Д. Я. Навіцкага.**

Байцы, камандзіры і палітработнікі Н-скай часці, якой камандуе тав. Марозаў, вылучылі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварышаў **Сталіна, Молатава, Калініна, Варашылава, Кагановіча, Жданава, М. М. Літвінава, А. А. Волкава.**

Віцебская фабрыка імя Фрунзе — таварышаў **Сталіна, Молатава, Варашылава, Кагановіча, Ежова, Мікаяна, Калініна, Жданава, А. А. Волкава** і **А. М. Лявіцкага.**

З ВЫСТАЎКІ «20 ГОД РСЧА І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТА». На здымку: карціна засл. дзеяча мастацтваў І. І. Бродскага «Народны камісар абароны К. Е. Варашылаў на лыжнай прагулцы». Фота Ф. Кіслова (СФ)

ВЫСТАЎКА „ДВАЦЦАЦЬ ГОД РСЧА і ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТА“

6 мая ў Маскве адкрылася выстаўка «Дваццаць год РСЧА і Ваенна-Марскога Флота». На выстаўцы прадстаўлена каля 450 твораў жывапісу, скульптуры і графікі. Творы лепшых мастакоў Совецкага Саюза, прадстаўленыя на выстаўцы, адлюстроўваюць слаўны дваццацігадовы шлях Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Першы раздзел выстаўкі складаецца з твораў, якія паказваюць старую царскую армію, работу большэвіцкай партыі па падрыхтоўцы ўзброенага паўстання і чырвоную гвардыю 1917—18 год. Найбольшую ўвагу ў гэтым раздзеле прыцягваюць карціны Чэрэмных «Провады» і Кукрыніксы «Раніца», а таксама карціны Владзімірскага «К. Е. Варашылаў у падпольным рабочым гуртку ў Луганску» і Чашнікава «Большэвіцкая лістоўка трапіла к салдатам», якія паказваюць асобныя эпізоды падпольнай работы большэвіцкай партыі.

Другі раздзел выстаўкі — «Чырвоная армія і Ваенна-Марскі Флот у баях за соцыялістычную радзіму». Творы, прадстаўленыя ў гэтым раздзеле, паказваюць, як Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна разграмілі полчышчы інтэрвентаў і белыя банды. Мастак Маравраў прадставіў карціну, якая паказвае стваральнікаў Чырвонай Арміі — таварышаў Леніна і Сталіна за гутаркай. У шматлікіх карцінах адлюстроўваецца баявая работа кіраўнікоў і арганізатараў Чырвонай Арміі, вялікіх пролетарскіх палкаводцаў, баявых ваенных камісараў, большэвікоў і народных герояў, якія аддалі жыццё сваё за шчасце рабочых і сялян. Шмат работ, прысвечана вялікім правадырам Леніну і Сталіну і таварышам Варашылаву, Фрунзе, Кіраву, Орджанікідзе.

Выдатную карціну даў мастак Хвасценка — «Выезд таварышаў Сталіна і Варашылава на баявую разведку у раён станцыі Зімоўнікі Царыцынскага фронта. Ліпень 1918 года». У гэтым-жа раздзеле выстаўлены карціны грузінскага мастака Кутатэладзе аб баявой рабоце Г. К. Орджанікідзе на Паўночным Каўказе ў 1918 годзе. Мастакі Жаба і Фрэнц прысвяцілі свае карціны баявой рабоце С. М. Кірава. Сераў выставіў карціну «Чапаеўскі штаб». Мастак Сокалаў-Скаля прадставіў трыпціх на тэму Шчорс. Палотны Сокалава-Скаля расказваюць аб эпізодах слаўнай барацьбы народнага героя Шчорса.

Многімі мастакамі выстаўлены карціны, якія адлюстроўваюць барацьбу Чырвонай Арміі ў годы грамадзянскай вайны. Сярод іх асабліва вылучаюцца работы: Мучніка — «Патапленне броненосца «Свабодная Россия», Фінагенава — «Запіс рабочых добраахвотнікаў на фронт», Карэва — «На фронт прывезлі газеты і свежыя пісьмы», Владзімірава — «Налёт чырвоных самалётаў на польскую конніцу ў 1920 годзе», Зеліхмана — «Прарыў польскага фронта Першай Коннай», Жаба — «Таварышы Варашылаў і Будзённы кіруюць пераправай Першай Коннай каля Каховкі», Самокіша — «Бегства врангелеўцаў», Качэргіна — «30-я дывізія граміць белабандытаў», Машкевіча — «Раззбраенне японскага атрада партызанамі».

Наступны вялікі раздзел выстаўкі — «Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот —на варце соцыялістычнай радзімы». У гэтым раздзеле выстаўлена выдатная карціна А. Герасімава — партрэт таварышаў Сталіна і Варашылава. Таварышы Сталін і Варашылаў назіраюць з двара Крэмля панараму будаўніцтва Палаца Советаў. Тут-жа карціны Сварога — «Даклад І. В. Сталіна на Надзвычайным VIII з'ездзе Советаў аб праекце Канстытуцыі Саюза ССР» і «Таварыш Сталін і члены Палітбюро на Тушынскім аэрадроме ў дзень авіяцыі».

Шматлікія палотны нашых мастакоў, выстаўленыя ў гэтым раздзеле, адлюстроўваюць магутнасць Чырвонай Арміі, паказваюць розныя роды войск. Пяхота, конніца і артылерыя адлюстроўваюцца ў карцінах: Касцяніцына — «Сустрэча Маскоўскай чырвонасцяжнай дывізіі пасля манеўраў», Авілава — «Выезд кулямётных тачанак», Савіцкага — «На манеўрах», Пластава — «Купанне коней», Рылава — «З данясеннем», Котава — «Баявая трывога» і іншых. Рад цікавых карцін адлюстроўваюць баявую вучобу танкістаў. Вялікая колькасць работ мастакоў прысвечана нашай авіяцыі і совецкім героям-лётчыкам.

Адной з выдатнейшых карцін, прадстаўленых на выстаўцы, з'яўляецца карціна І. Бродскага «Варашылаў на лыжнай прагулцы». Гэта адзін з лепшых і буйнейшых твораў мастака.

Спецыяльная зала на выстаўцы прысвечана Ваенна-Марскому Флоту. У шматлікіх карцінах адлюстроўваецца баявая вучоба чырвонафлотцаў, рост і ўмацаванне Чырвонага Флота. Значнае месца на выстаўцы займаюць карціны, якія адлюстроўваюць партыйна-палітычную работу, культуру, быт Чырвонай Арміі, а таксама работы, якія паказваюць яднанне ўзброеных сіл нашай радзімы з совецкім народам.

Тэме «Сталінская Канстытуцыя і Чырвоная Армія» прысвечаны карціны Любімава, Перэльмана, Мадорава, Одзінцова.

Апошні раздзел выстаўкі — «Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот на варце свяшчэнных граніц СССР». Тут выстаўлены карціны Авілава, Бялыніцкага-Бірулі, Бубнова, Карэва, Бакшэева, Меркулава, якія адлюстроўваюць гераічныя будні пагранічнікаў.

На выстаўцы прадстаўлены лепшыя работы буйнейшых старэйшых мастакоў Совецкага Саюза і маладых мастакоў.

Выстаўка «Дваццаць год РСЧА і Ваенна-Марскога Флота» паказвае бяспрэчны рост совецкага батальнага жывапісу, з'яўляецца яркай дэманстрацыяй росквіту выяўленчага мастацтва ў нашай краіне, творчага росту нашых мастакоў.

Выстаўка карыстаецца вялікай папулярнасцю ў працоўных сталіцы Совецкага Саюза. Штодзённа выстаўку аглядаюць чырвонаармейцы, камандзіры, рабочыя, інтэлігенцыя, школьнікі. Сотні і тысячы працоўных з вялікай цікавасцю аглядаюць залы выстаўкі, таленавітыя работы нашых мастакоў. Выстаўка захапляе гледача і заклікае быць гатовым у кожную мінуту да абароны свяшчэнных граніц вялікага Совецкага Саюза.

ДЗЕННІК ПЛЕНУМА ССП БССР

10 мая ўвечары ў зале пасяджэнняў Дома пісьменнікаў адкрыўся пленум Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. На адкрыцці пленума прысутнічалі не толькі пісьменнікі, паэты, але і многія работнікі нашых тэатраў, кампазітары. Толькі Упраўленне па справах мастацтваў і кінаарганізацыі не палічылі неабходным прыслаць на пленум сваіх прадстаўнікоў.

Пленум адкрыў кароткім уступным словам выконваючы абавязкі старшыні праўлення ССПБ тав. М. Лынькоў.

— Мінулы год, — кажа тав. Лынькоў, — быў годам найвялікшых здабыткаў на ўсіх участках нашага соцыялістычнага будаўніцтва, годам вялікага ачышчэння краіны ад трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх бандытаў, годам разгрому заклятых ворагаў народа, якія пасягалі на вялікія заваёвы Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Як-жа мы, — ставіць пытанне тав. Лынькоў, — як пісьменнікі, як інжынеры чалавечых душ, удзельнічалі ў вялікай справе будаўніцтва новага свету, ці былі мы добрымі, прыкладнымі сынамі сваёй радзімы, яе прыкладнымі грамадзянамі? Як удзельнічалі мы сваім мастацкім словам у агульным жыцці народа, у яго змаганні за соцыялізм, як ліквідавалі мы вынікі шкодніцтва ў нашай літаратуры?

Адказ на гэта, — кажа тав. Лынькоў, — і павінен даць наш пленум, прысвечаны пытанням перабудовы ўсёй сістэмы нашай арганізацыйнай і творчай работы...

Пасля зацвярджэння павесткі дня, рэгламенту і парадку работы, слова для справаздачнага даклада праўлення ССП БССР атрымлівае тав. М. Лынькоў.

Дакладчык падрабязна гаворыць аб рабоце Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

...Бурнымі воплескамі сустракае пленум прапанову паслаць прывітанне вялікаму настаўніку і другу таварышу Сталіну.

Пленум таксама прымае прапанову паслаць прывітанне старэйшаму паэту Совецкага Саюза — акыну Казахстана Джамбулу ў сувязі з 75-годдзем яго творчай работы.

***

На ранішнім пасяджэнні пленума 11 мая пачаліся спрэчкі па дакладу тав. Лынькова. Першым просіць слова народны паэт БССР **Якуб Колас,** які ў сваім выступленні закранае два пытанні — аб сучаснай тэматыцы ў творчасці пісьменнікаў і аб складанні падручніка па гісторыі беларускай літаратуры. Спасылаючыся на словы дакладчыка аб тым, што асаблівасцю тэматыкі маладых пісьменнікаў з'яўляецца шчыльная ўвязка з нашай рэчаіснасцю, чым яны выгодна адрозніваюцца ад старых пісьменнікаў, якія нібы імкнуцца ўхіліцца ад гэтай сучаснасці,—тав. Колас кажа: старыя пісьменнікі ўхіляюцца ад гэтых тэм не таму, што яны іх баяцца, не хочуць імі займацца, а таму, што ведаюць гэту сучаснасць не так добра, як яе ведаюць маладыя пісьменнікі. Тав. Колас тлумачыць гэта тым, што маладыя пісьменнікі нарадзіліся, выраслі ў нашай совецкай атмасферы, і што ўся іх свядомасць, ускрыцце базіруецца на нашых совецкіх умовах, умовах совецкага жыцця. У гэты-ж час старыя пісьменнікі, жывучы часцей за ўсё на адным месцы, у адным горадзе, адрываюцца ад жыцця. Тав. Колас робіць вывад, што пісьменнікам трэба так планіраваць свой час і сваю творчую работу, каб мець магчымасць арганізоўваць больш рэгулярна выезды ў раёны, у іншыя гарады.

— Нам трэба часцей акунацца ў жыццё, — кажа тав. Колас, — нам трэба збіраць матэрыялы, жывыя матэрыялы, знаёміцца з людзьмі, узбагачваць свой багаж, мы крыху адсталі ў гэтым сэнсе...

Па пытанню аб напісанні падручніка па гісторыі беларускай літаратуры тав. Колас кажа, што час ужо выканаць неаднаразовыя ўказанні ЦК КП(б)Б і даць нашай школе, нашым настаўнікам нарысы па гісторыі беларускай літаратуры.

Слова атрымлівае малады пісьменнік тав. Небыліца. Ен піша на украінскай мове і адно сваё апавяданне паслаў для ацэнкі габінету маладога аўтара ССП Украінскай ССР. Адказ ён атрымаў праз дзесяць месяцаў пасля пяці напамінкаў. У габінеце маладога аўтара ССП БССР ён атрымлівае адказы сістэматычна, але кожны пісьменнік, каму трапляе матэрыял для рэцэнзіі адказвае па-рознаму. Тав. Небыліца таксама спыняецца на тым, што колькасць перакладаў з украінскай мовы на беларускую вельмі нязначная і што ў бібліятэках мала літаратуры на украінскай мове.

(ПРАЦЯГ НА 4 СТАР.)

РАДЗІМЕ і ПРАВАДЫРУ

ВЕРШЫ І ПЕСНІ АБ СТАЛІНСКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ

«Читайте,
завидуйте,
я —
гражданин
Советского Союза».
Вл. МАЯКОВСКИЙ.

I

Аб Сталіне-сейбіту песня мая,
А песня ад сэрца і звонка, як медзь,—
Якую ў жніво пяе ў полі жняя,
Якую ў касьбу пяе ў лузе касец.

Багата ўраджаем
Зямля расквітнела,
У будучнасць людзі
Узіраюцца смела.

Аб Сталіне-сейбіту песня мая,
А песня з душы і гартоўна, як сталь,—
Якую пяе арлоў горных сям'я,
Якую пяе пры кавадле каваль.

Арлы-самалёты
Усё неба ўзялі
І волю здабылі
Сабе кавалі.

Аб Сталіне-сейбіту песня мая,
А песня ад сонца, ад зор залатых, —
Якую пяе уся наша зямля,
Аб сейбіту светлы разносячы слых.

Ён даў для народаў
Асноўны закон,
І дружбу народаў
Навек стварыў ён.

II

Я з гэтаю песняй, як зоры, высокай
Выходжу ў прасторы дарогай шырокай,
У думках і марах раблю свой абход
На поўнач і поўдзень, на захад і ўсход.

Я сам—гаспадар неабсяжнай краіны
І верны слуга дарагое айчыны,
Народу майго гераічнага сын —
Савецкай рэспублікі грамадзянін.

Са мною гаворыць, як-быццам жывая,
Сагрэтая сонцам зямля маладая,
Імклівыя рэкі, дарог паясы,
Лугі і палеткі, бары і лясы.

Увесь гэты скарб, незлічона-багаты:
Шырокія нівы і светлыя хаты,
Укрытыя лістам і цветам сады,
Залітыя срэбным святлом гарады,

Чыгункі і шахты, палі і заводы,
Глыбокія нетры і плынныя воды,
Высокага неба празрысты блакіт
І гоманы пушчы, і шэлест ракіт.

Усё, да апошняй пясчынкі зямлі
На ўзоранай трактарным плугам раллі,
Ад краю—у край, ад заходу—да ўсходу
Належыць майму маладому народу.

І скрозь над усім неабсяжным прасцягам
Жыццё пурпуровым абвеена сцягам,
Дзе золатам радасці вышыты герб:
У сонечных променях молат і серп.

І скрозь наша доля пад сцягам чырвоным
Асвечана Сталінскім мудрым Законам,
Дзе кожная літара—шчасцем для нас
Гарыць, як крыштальна-агністы алмаз.

І вольны народ за жыццё і дзяржаву
Спявае вялікаму Сталіну славу...

* * *

Беларуская краіна,
Твой шырокі шлях!
Над табой у зорнай сіні
Палымнее сцяг.

Гэта ты упартай воляй
На прастор і шыр
Вывеў нас з былой няволі,
Мудры правадыр.

І цвіце мой край чароўных
Пушчаў і азёр
У сям'і свабодных, роўных
Маладых сясцёр
Гэта ты рукою дужай
Даў народам мір,
Нас навек з'яднаўшы дружбай,
Мудры правадыр.

І ніякія напасці
У самы трудны час
Не парушаць долі-шчасця,
Не падзеляць нас.

Мы ідзем адной калонай,
Бурнаю. што вір,
Пад зарой твайго Закона,
Мудры правадыр.

І сабраўшыся на першы
Незвычайны сход.
У Совет сыноў найлепшых
Выбера народ.

Ты да новай перамогі
На прастор і шыр
Нам паказваеш дарогі,
Мудры правадыр.

III

Між кветак і дрэў на заводскім двары
Сышліся у час перапынку сябры.
І я падышоў і прысеў каля іх.
Сябры гаварылі аб справах сваіх.
Прыемна вясновай лагоднай парой
Сабрацца, пагутарыць паміж сабой.

Здаецца, яшчэ гэта ўчора было,—
Тут ветры гулі, сухазелле расло,
Дзічэлі ў абдымках густой нематы
Спрадвеку пакрытыя пылам кусты.
А сёння тут цуда стварае народ:
Збудованы сонечны горад-завод.

Наўсцяж камяніцы,—іх вырасла шмат,—
Абкружаны шумам кляновых прысад.
З узнятай рукою, як мужнасці кліч,
На плошчы стаіць неўміручы Ільіч.
Ля помніка мудрага правадыра
Вясёлыя песні пяе дзетвара.

Я помню—нас тысячы гэткіх, як я,
На працу паэвала краіна мая
І ў спёку, і ў сцюжу, і ноччу, і днём—
Зямлю абуджаў, не спіхаючы, гром.
Я цэглу за цэглай у сцены ўкладаў,
Я сам сваё шчасце сабе будаваў.

Я знаю, што мне беспрацоўным не быць,
Што голад не будзе за мною хадзіць.
Радзіма! Яна прад вачыма ўстае,
Нам права на працу і радасць дае.
Гляджу на сяброў,—на шчаслівых людзей:
Няма ў іх трывогі за заўтрашні дзень.

Сагрэтыя сталінскім сонцам вясны,
Былое жыццё ўспамінаюць яны:
Калісь працавалі з цямна да цямна,
А песціла толькі галеча адна.
Цяпер наша праца—і радасць, і чэсць,
А хто не працуе—той і не есць!

Прарэзаў блакітную цішу гудок,
Сябры мае ўсталі, паскорылі крок.
Як добра на поўныя грудзі дыхнуць,
Сваю маладосць баявую адчуць!
І цешыцца сэрца.. А хто з нас не рад?
І кожны становіцца зноў за варштат.

Зноў коціцца гул гаварлівых машын,
Зноў праца ўскіпае, і ўсе, як адзін,
З любоўю і ўпартасцю гаспадара
Куюць незлічоныя скарбы дабра.
І я між сяброў за варштатам стаю,
Працую і песню ад сэрца пяю...

* * *

Люблю працаваць я на славу,
Люблю, калі праца кіпіць.
А родная наша дзяржава
Мне права дае адпачыць!
І клікнуць мяне параходы
Праз гоман стэпоў і далін
Як добра жывецца народу
Шчаслівых совецкіх краін!

Я сталінскай ласкай сагрэты,
Люблю я вандроўнікам быць
І сцежкамі звонкага лета
Прасторам радзімы хадзіць.
Ніколі, ні ў якія годы
Не ведалі гэткіх часін.
Як добра жывецца народу
Шчаслівых совецкіх краін!

Са стрэльбай сваёй за плячыма
Люблю паляваць на зары,
Калі туманамі, як дымам,
Закрыты густыя бары.
Спраўляць з дзетварой карагоды
Люблю я пад шумам рабін.
Як добра жывецца народу
Шчаслівых совецкіх краін!

Люблю я прыгожасці Крыма,
Каўказскіх аснежаных гор,
Люблю цябе, наша радзіма,
Твой сонцам заліты прастор.
Табе я адданы заўсёды,
Я—родны і верны твой сын.
Як добра жывецца народу
Шчаслівых совецкіх краін!

IV

Старая я. Мне шмат гадоў.
Я многа маю расказаць
Дачок пяцёра, сем сыноў
Мне давялося гадаваць.

Сляза па твары пацячэ,
Калі аб днях успомніш тых:
Устанеш досвіткам яшчэ,
Навaрыш поліўкі на ўсіх.

Малых — аж цесна у кутку,
Адной іх трэба дагдядаць:
На плечы возьмеш, на руку,
На поле пойдзеш жыта жаць.

На шнур паставіш таганы,
Дзяцей палажыш, ды адна,
Не разгінаючы спіны,
Сярпом махаеш да цямна,

Так замардуешся за дзень,
Што ледзь ступаеш ідучы,
Да хаты вернешся як пень,
Ніхто не скажа адпачыць.

Жанчына чахла без пары:
Бяспраўе скрозь, пакуты, здзек.
Сцвярджаў усім закон стары:
Яна—раба, не чалавек.

Мінулі чорныя гады...
Спявайце, сёстры, весялей:
Цяпер і яслі і сады —
Усё для матак і дзяцей.

Шчаслівы дзень! Шчаслівы час!
Наш край, ты казкаю расцвіў!
Вялікі Сталін, бацька наш,
Дзяцей да сэрпа прытуліў.

Ён мае шмат дачок, сыноў,
На ўсю зямлю яго сям'я.
Нямала мне, старой, гадоў,
Ды вельмі ганаруся я,

Што з ім жыву адной парой,
Што маладзею я цяпер.
Пілотаў тры ў сям'і маёй,
Дзве трактарысткі, інжынер.

Дарогу кожны адшукаў,
Усіх ён вывеў нас у свет,
Усе правы жанчынам даў, —
Іх выбіраюць у совет.

Прымі, настаўнік, ад жанок,
Ад матак, радасных сясцёр
З вясновых кветак наш вянок,
Абсыпаны агнямі зор.

Ты наша сонца! Нам квітнець
Пад ясным поглядам тваім,
Давайце, сёстры, будзем пець
Аб нашым сонцы дарагім!

Хай наша песня на усход
Ляціць, як птушка, да Крэмля...
Як славіць Сталіна народ!
Як славіць Сталіна зямля!

* * *

Ой, шумі ты, радуйся,
Беларускі бор.
Узлятай ты, песенька,
Да высокіх зор,

Праляці над гоманам
Спелых каласоў,
Праляці над плошчамі
Шумных гарадоў,

Над Масквой-сталіцаю
Сокалам кружы,

Раскажы ты Сталіну,
Роднаму скажы,

Што жанкі шчаслівыя
Радасна жывуць,
Што яму ад сэрцайка
Прывітанне шлюць.

Ой, шумі ты, радуйся,
Беларускі бор.
Узлятай ты, песенька,
Да высокіх зор!



V

Сядзем, сынку, на хвіліну
Ды зірнем наўкола.
Час абраць табе пуціну —
Кліча цябе школа.

Глянь, арлёнак мой шчаслівы,
На свой шлях прасторны:
Лёг ён, ясны ды жычлівы,
Праменісты, зорны.

Ідзі смела, дзе ты хочаш
І дзе сэрцу люба:
Пала ў вечнасць цемра ночы,
Наш прыгнёт і згуба...

Не было калісьці ходу,
Выхаду з туману:
Замест школ — астрог народу,
А навука — пану.

З нашай працы шмат гімназій
Паны будавалі,
Нас-жа, бедных, у сярмязе,
У іх не пускалі.

З нашых скарбаў, з роднай мовы
Учынялі здзекі,
Толькі й чулі нас дубровы,
Поле, луг ды рэкі.

Не прасторныя — крывыя
Мелі мы дарогі;
Вандравалі з торбай, з кіем,
Што ні крок — парогі.

Вам-жа, племя маладое,
Дні вясны настал —
Даў жыццё вам залатое
Родны бацька Сталін!

Вам, здаровым і вясёлым,
Цвет зямлі Саветаў,
Збудавачы клубы, школы,
Універсітэты.

Пра навуку урачыста
У сваім законе
Сталін сэрцам комуніста
Напісаў сягоння.

Вам, вясёлым сакалятам
Вольнага народа,
Даў ён шчодра і багата,
Каб дабром валодаць;

Каб узброіць вашы сілы
Бальшэвіцкай воляй,
Каб наш край чырвонакрылы
Узбагаціць болей;

Каб умножыць нашу славу,
Сілу даць айчыне,
Каб мы Ленінскую справу
Узнялі ў вышыні;

Каб узнеслі над зямлёю,
Па-над цэлым светам
Край наш грозную скалою,
Сонцам-яснацветам

* * *

Прасветлелі вочы,
Беларусь, твае.
Аб жыцці шчаслівым
Твой народ пяе.

Заквітнелі буйна
Сёлы, гарады, —
Не ясі ты болей
Хлеба з лебяды.

Стала ты багатай,
Станеш багацей,

Сталінскія школы
Маеш для дзяцей.

Ясныя дзянніцы
Глянулі на нас.
Грымнем дружна песню
Пра вясёлы час!

Вольнай Беларусі —
Шырыня, разгон.
Песняю мы славім
Сталінскі Закон.

VI.

На чатырнаццаць дзён дамоў
Прыехаўшы з граніцы,
Да дзеда ў госці я прышоў,
Як бліскалі зарніцы.

Абшар арцельнага дабра
Мы вартавалі з дзедам.
Ужо чаканая зара
Займаецца над светам.

Абходжу разам з дзедам я
Світальныя прасторы.
І мы прышлі да ручая.
У небе гаснуць зоры.

Умыўся дзед. Звініць вада,
Празрыстая, лясная.
Яго сівая барада
Увесь ручай займае.

Ідзем на стан. Паважна ён
Дае наказ калгасны:
Ахоўваць Сталіна Закон —
Радзімы розум ясны.

Старонкай з кнігі залатой
Здаецца поле дзеду,
Бо Сталін дбалаю рукой
Зямлю засеяў гэту. -

Праходзіць дзед з кійком сваім
І мудры сказ чытае,
І кожны колас перад ім,
Як літара жывая.

Ідуць унукі жыта жаць
Сцяжынкаю зялёнай,
А мы—на стан — адпачываць
Пасля начы бяссоннай.

Турботы дзедавы ў цішы
На хвалях ураджая
Пад жніўны спеў закалышы,
Радзіма дарагая!..

Я ведаю — на цэлы свет
Закон сцвярджае проста:

Жыві, працуй, шчаслівы дзед,
Гадоў за дзевяноста,

Жыві ў пашане сярод нас
На славу ўсёй краіне, —
Цябе дзяржава і калгас
Без хлеба не пакіне.

На чорнаморскі светлы пляж
Паехаць маеш права —
Шануе твой працоўны стаж
Совецкая дзяржава.

Ахоўвае твае правы
У старасці глыбокай
Закон радзімае Масквы
Пад зоркаю высокай.

* * *

Калгаснай сялібай
Праходзяць дзяды,
На іхным шляху —
Маладыя сады.

І яблык з галінак
Здымаюць яны —
І самы даспелы,
І самы буйны.

У лес, што сваім
Называлі паны,
Прыходзяць калгаса
Сівыя сыны.

І кошык сплятуць
Каля светлай вады,

І ягад лясных
Назбіраюць дзяды.

А там, дзе калісьці
Балота было,
Арцельнае збожжа
Да неба ўзрасло.

І звяжуць дзяды
Залатыя пучкі:
Ад кожнага поля
Па тры каласкі.

Сустрэнуць іх людзі,
Спытаюць: куды?
— Да Сталіна ў госці! —
Адкажуць дзяды.

VII.

Ідзе правадыр па бязмежным прасторы,
Спакойны і просты, а вочы, як зоры,
Што праменем ясным наскрозь праналі
І глыб акіянаў, і нетры зямлі.

У сэрца ён кожнаму глянуць умее,
Выполвае злое, разумнае сее —
Вялікі і мудры ў сваёй прастаце,
Дзе гляне, там радасць і слава расце,

Адвагай і мужнасцю поўняцца грудзі,
І подвігі твораць звычайныя людзі,
І край мой — шчаслівы і песняй звініць,
І будзем мы песню грудзьмі бараніць.

Навокал нямала драпежнікаў лютых,
І нашыя песні — ім горай атруты,
І точыць ім сэрца зялёная злосць...
Па смерць сюды прыдзе няпрошаны госць!

Ёсць што бараніць нам і чым бараніцца:
Скала непрыступная — наша граніца,
І пораху хопіць у нас і свінца,
Каб ворагаў знішчыць усіх да канца.

І армія наша абута, адзета,
Вялікай любоўю народа сагрэта;
Яе камандзіры — працоўных сыны,
На смерць за радзіму гатовы яны.

Зямля аж гудзе, як ідуць батальёны, —
Вядзе Варашылаў герояў мільёны,
І кожны — радзімы сваёй патрыёт.
І ворагу сэрца праб'е навылёт.

Над хмарамі грозна ракочуць маторы,
Сталёвыя птахі ўзвіліся пад зоры,
Праз вецер і хмары ідуць напралом,
У кожнага — ворагу смерць пад крылом.

І я — грамадзянін вялікай краіны,
Яе бараніць у цяжкія хвіліны,
Калі да мяжы падпаўзе гадаўё,—
І мой абавязак, і права маё.

Падхоплены бурным парывам адзіным,
І я разганюся ў палёце арліным
І ворага метка на мушку вазьму,
Каб трапіць у самае сэрца яму.

Мы сілы падвоім, мы храбрасць патроім,
Іх прагнаць мы іх-жа крывёю напоім, —
Як ворану вышай арла не лятаць,
Так ворагу нашай зямлі не таптаць.

* * *

На золку рана конь заржаў,
Баец з пабыўкі ад'язджаў,
З падругай вышаў за сяло,
Абняў, ускочыў на сядло, —

Бывай, краса мая, бывай!
Я бараніць іду свой край.
Бывай!

Калі настане грозны час —
Радзіма ў бой пакліча нас,
Я клятву верную даю —
Не быць апошнім у баю.

Бывай, краса мая, бывай!
Я бараніць іду свой край.
Бывай!

Насустрач буры і агню
Я смела шпоры дам каню,
За шчасце наша, за красу
Фашысту голаву знясу.

Бывай, краса мая, бывай!
Я бараніць іду свой край.
Бывай!

Чакай — вярнуся жыў-здароў,
Героем я прыду дамоў.
Сустрэць ты выйдзеш за сяло,
Цябе вазьму я на сядло.

Бывай, краса мая, бывай!
Я бараніць іду свой край.
Бывай!

VIII.

Сустракай, мая краіна,
Дзень свой урачысты,
Што ідзе к табе гасцінна
Ясны, праменісты.

Прыбірайся гожа, дбала,
Упрыгожвай хаты:
Каб ты слаўна святкавала
Гэтакае свята.

З цемры гнёту, здзеку, гора,
З занядбанай долі
Вышла сёння ты ў прасторы
Бальшэвіцкай воляй.

У ясноты дзён праз хвалі
Бур, вайны, аблогі
Вывеў Ленін, вядзе Сталін
Вернаю дарогай.

У баях з ардой драпежнай,
З панскаю навалай
Стаць краінай незалежнай
Права здабывала.

Здабыла ты гэта права
Дружбаю народаў.
Усім народам нашым слава!
Слава іх паходам!

На разлог калгасных гоняў,
На гмах лесу сіні
Пазіраеш ты сягоння
Вокам гаспадыні;

На дарогі, што па краю
Носяць шум імклівы;
На балоты, дзе буяюць
Маладыя нівы;

На паселішчы, на сёлы,
Гарады, заводы
І на свой народ вясёлы,
На яго прыгоды.

Дык выходзь, мая краіна,
Як сястра да брата,
Высылай дачку і сына,
Свой народ, на свята!

Грамадой, як сталь, з'яднанай
Вышлі самых лепшых,
Самых шчырых і адданых
У парламент першы,

Каб усё сваё стараннe,
Волю, сілу, мэты
Аддалі на красаванне
Сталінскіх саветаў.

IX.

Табе, правадыр, мае песні і думы,
І шчырыя шчырага сэрца парывы!
Бо хто калі сніў, ды і хто калі думаў,
Што буду я вольны, што буду шчаслівы.

Бо хто калі думаў, што я жыці буду,
Як птушка, як вецер над нівай квяцістай,
І дзівам дзівіцца вялікаму цуду,
Што вокал мяне так цудней урачыста.

Што ты, правадыр, нібы яснае сонца,
Мне вочы адкрыеш на землі і неба...
Свяціся-ж ты, сонца, ў маё век аконца!
Вітаю цябе я і соллю, і хлебам.

Іспі ўперад будуць вякі, пакаленні,
Законы-ж твае, нібы светач нязгаслы,
Шляхі асвятляць будуць светлым імкненнем,
Знішчаць рабаўласніцтва трухлыя праслы.

Тваіх, правадыр мой, законаў асновы,
Тваёй Канстытуцыі мудрыя сказы
Грудзьмі бараніць у змаганні суровым —
Мой гонар вялікі і мой абавязак.

Табе, правадыр, мае песні і думы,
І шчырыя шчырага сэрца парывы!
Бо хто калі сніў, ды і хто калі думаў,
Што буду я вольны, што буду шчаслівы!

ЯНКА КУПАЛА, ЯКУБ КОЛАС, АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ, ПЯТРУСЬ БРОЎКА, ПЯТРО ГЛЕБКА, КАНДРАТ КРАПІВА, АРКАДЗЬ КУЛЯШОЎ.

Май, 1938 г.

ПЛЕНУМ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ДАКЛАД в. а. СТАРШЫНІ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА тав. М. Ц. ЛЫНЬКОВА*)

Мінулы год у жыцці народаў вялікага Совецкага Саюза быў годам выключнейшых перамог на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва.

У 1937 годзе героі з герояў, нашы мужныя лётчыкі дабіліся нечуваных перамог—праз лёдавыя пустыні Арктыкі, праз моры і акіяны зрабілі смелыя пералёты ў Амерыку, пакарылі Паўночны полюс. Каго не хвалявала цудоўная папанінская эпапея, паказаўшая бязмежныя магчымасці совецкай навукі, бязмежную мужнасць, адвагу, волю да перамогі нашых совецкіх людзей.

Тысячы прыкладаў мужнасці, гераізма далі слаўныя нашы ваенныя лётчыкі, танкісты, артылерысты і прадстаўнікі ўсіх відаў чырвонай зброі. Храбрая сям'я герояў Совецкага Саюза вырасла за апошні год, папоўнілася не адным дзесяткам лепшых сыноў нашай радзімы.

Мінулы год быў годам росквіту нацыянальных мастацтваў, годам сапраўднага росквіту народнай творчасці.

Юбілеі Пушкіна, Руставелі, Некрасава паказалі, з якой выключнай пашанай і любоўю адносяцца народы Совецкага Саюза да найвялікшых здабыткаў культуры кожнага народа, як узаемна ўзбагачаюцца гэтыя культуры.

Толькі ў краіне сонечнага соцыялізма сустракаем мы такую любоў і такія клопаты аб культуры, аб мастацтве, аб найлепшых песнярах і творцах мастацкага слова, незалежна ад таго, ці жывуць яны і працуюць цяпер, ці яны жылі і тварылі за некалькі стагоддзяў да нашых непаўторных дзён.

Мінулы год быў годам росквіту нашай совецкай дэмакратыі, рэальнага ўвасаблення ў жыццё гераічнага совецкага народа Сталінскай Канстытуцыі, годам, калі ўпершыню ў гісторыі народы Совецкага Саюза пасылалі сваіх найлепшых сыноў у свой першы соцыялістычны парламент, калі на выбарах у Вярхоўны Совет СССР яркую перамогу атрымаў блок комуністаў і беспартыйных, тым самым паказаўшы найвялікшае і непарушнае давер'е працоўных да партыі Леніна—Сталіна.

У мінулым годзе народы Совецкага Саюза ўрачыста падвялі вынікі дваццаці гадам сваёй барацьбы і перамог за справу соцыялізма. І вынікі аказаліся дзівоснымі — совецкі народ па праву адсвяткаваў сваё поўналецце, ён узмужнеў, вырас у вялікую і непераможную сілу, якая пераможа і разаб'е ўшчэнт стары капіталістычны свет.

Мінулы год быў годам вялікага ачышчэння нашай краіны ад трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх бандытаў, ад усякага смецця з фашысцкай падваротні, якое падкідвалі да нас фашысцкія дзяржавы ў выглядзе шпіёнаў, дыверсантаў, шкоднікаў і ўсякай іншай нечысці. Ворагі атрымалі сакрушальны адпор, разгром ворагаў роўнасільны буйнейшай перамозе ў вялікай вайне.

У мінулым годзе мы чулі непаўторныя словы таварыша Сталіна аб бессмяротнасці народа, аб павазе да народа, аб тыпе совецкага палітычнага дзеяча-большэвіка. Гэтыя словы даюць нам яркае ўяўленне аб асновах нашай дзяржаўнасці, аб непарушнасці сувязі нашых дзеячоў з народам, аб вялікім адзінстве інтарэсаў дзяржавы, урада і народа.

Мінулы год даў нам багата новых бліскучых твораў у вялікай рускай літаратуры. Творы А. Талстога, М. Шолахава, А. Фадзеева, В. Катаева ўзнялі на новую ступень сучасную рускую літаратуру. На гэтых творах выхоўваюцца мільёны чытачоў Совецкага Саюза.

Чароўнай кветкай расквітнела паэзія старэйшага паэта Совецкага Саюза, акына казахскіх стэпаў Джамбула. Песні яго сталі песнямі народаў СССР і—яркія, вобразныя, поўныя глыбокай чалавечай лірыкі — не абмінаюць ні адной падзеі, ні адной выдатнай справы ў нашай шчаслівай радзіме. І шмат каму з нашых паэтаў — і рускіх і паэтаў усіх нашых братніх рэспублік—можна многаму і многаму павучыцца ў Джамбула.

Такім быў мінулы год.

Вось тыя абставіны велізарнага ўздыму і росту ўсёй совецкай дзяржавы, у якіх жылі і працавалі работнікі і нашай беларускай совецкай літаратуры. Вялікае ачышчэнне, праведзенае ў радах нашай літаратурнай арганізацыі, ачышчэнне ад усякіх ворагаў—трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх бандытаў — аздаравіла ўсю атмасферу ўнутры арганізацыі, стварыла ўсе прадпасылкі для разгортвання нармальнай творчай работы кожнага пісьменніка і паэта.

Трэба сказаць, аднак, што працэс ачышчэння нашых радоў праходзіў без актыўнага нашага ўдзелу ў справе выкрыцця замаскіраваўшыхся ворагаў, што мы праявілі тут выключную беспалотнасць, выключнае прытупленне палітычнай пільнасці. Праўда, мы выключылі з саюза падазроных людзей, выключылі яўна варожыя элементы, выключылі выпадковыя элементы. Некаторыя з іх, як выявілася насля, былі заўзятымі ворагамі народа.

Але асноўная маса ворагаў была выкрыта паміма нашага ўдзелу—слаўнымі органамі НКВД. Я не спыняюся тут падрабязна на падрыўной дзейнасці ворагаў. Яны рабілі ўсё, каб падарваць літаратуру, накіраваць яе на шкодны шлях, пасварыць пісьменнікаў, у прыватнасці пісьменнікаў-комуністаў з пісьменнікамі беспартыйнымі, растліць няўстойлівыя элементы ў літаратурным асяроддзі, адарваць нашу беларускую совецкую літаратуру ад літаратуры Совецкага Саюза, нашу культуру—ад культуры вялікага рускага народа.

Аздараўленне нашых радоў, ачышчэнне іх ад ворагаў спрыяла творчай актывізацыі ўсяго пісьменніцкага калектыва, і мы маем рад бясспрэчных дасягненняў ва ўсіх жанрах нашай літаратуры — у драматургіі, у прозе, у паэзіі, у нашай дзіцячай літаратуры.

Я пачну з драматургіі, маючы на гэта некаторыя падставы. Да апошняга часу гэты ўчастак нашай літаратуры лічыўся ў нас самым адсталым. Мы гаварылі, — і тут была пэўная доля ісціны, — што нашы драматургі, за нязначнымі выключэннямі, не стварылі ні адной п'есы, якая была-б значнай падзеяй у тэатральным жыцці, аб якой загаварылі-б, якая карысталася-б належнай увагай у Совецкім Саюзе. І мне здаецца, што іменна цяпер наша беларуская драматургія знаходзіцца напярэдадні вялікага пералому, напярэдадні стварэння сапраўдных поўнакроўных драматургічных твораў, якія ва ўсёй паўнаце пакажуць наша жыццё, якія паставяць нашу драматургію ў адзін рад з найлепшымі здабыткамі тэатральнага мастацтва Совецкага Саюза. І тое, што напісана, і тое, што ствараецца, дае нам усе падставы заявіць, што нашы драматургі ўзяліся за справу сур'ёзна, знаходзяцца на правільным шляху.

Што-ж канкрэтна зроблена нашымі драматургамі. За гэты час з'явілася п'еса народнага паэта Якуба Коласа «У пушчах Палесся». Яна напісана на матэрыялах аповесці «Дрыгва». П'еса атрымала спагадлівыя водгукі шматлікіх яе слухачоў. Яна дала нам яркі вобраз народнага героя, героя-партызана нашага совецкага Палесся. Яна паказала нам велізарнейшыя змены, што адбыліся ў жыцці колішніх палешукоў, якія з прыходам рэволюцыі, у барацьбе з адвечнымі ворагамі—белапалякамі, у барацьбе за слаўную сваю будучыню, упершыню ў гісторыі свайго існавання адчулі сябе поўнапраўнымі людзьмі, шчаслівымі членамі дружнай сям'і совецкіх народаў.

М. Клімковічам напісана п'еса «Кацярына Жарнасек». Тэма яе ўзята з далёкай мінуўшчыны. Але гэта мінуўшчына жыва пераклікаецца з нашым сучасным днём. І ў вобразах былых ворагаў беларускага народа мы лёгка пазнаём рысы іх паганых сучасных патомкаў, якія задумалі ў нашы дні аднавіць крывавыя ўзы колішніх уній з панскай шляхтай. У п'есе дадзены поўнакроўныя вобразы, героі яе надоўга запамінаюцца, п'еса багата насычана фальклорам, яна хвалюе нас праўдзівым мастацкім паказам жыцця нашых продкаў, якія ў сівой мінуўшчыне ўзнімалі сякеру і вілы супроць народных захрыбетнікаў, супроць гвалтаўнікоў і прыгнятальнікаў з каронная Польшчы. П'еса рыхтуецца да пастаноўкі, і нам застаецца пажадаць тэатру зрабіць поўнакроўны спектакль на багатым матэрыяле п'есы.

Заканчвае п'есу Кузьма Чорны.

Кандрат Крапіва напісаў п'есу «Партызаны». Яна пастаўлена ў тэатры і атрымала самы цёплы прыём гледачоў і спрыяльныя водгукі прэсы.

Новая п'еса напісана І. Гурскім.

У сувязі з падрыхтоўкай да выбараў у Вярхоўны Совет БССР нашы драматургі тт. Клімковіч, Чорны, Гурскі, Рамановіч і Ільінскі напісалі аднаактныя п'есы, прысвечаныя выбарам.

Вялікай увагі заслугоўвае работа нашых пісьменнікаў над стварэннем беларускай арыгінальнай оперы. Тав. Броўка напісаў лібрэта оперы «Міхась Падгорны». Тав. Рамановіч напісаў лібрэта оперы паводле аповесці Коласа «Дрыгва». Працуюць над лібрэта тт Глебка і Шапавалаў. Залішне гаварыць аб значэнні гэтай работы ў культурным жыцці нашай рэспублікі.

Аб нашай паэзіі. Нашы паэты не здаюць сваіх слаўных пазіцый, заваяваных імі «Пісьмом беларускага народа таварышу Сталіну» і «12 песнямі аб Чырвонай Арміі». У часе выбараў у Вярхоўны Совет СССР нашы паэты, пачынаючы ад народных паэтаў Янкі Купалы і Якуба Коласа і канчаючы самымі маладымі аўтарамі, далі нямала добрых баявых вершаў, прысвечаных таварышам Сталіну і Варашылаву, Сталінскай Канстытуцыі і самім выбарам.

Група нашых паэтаў напісала цяпер калектыўны твор, прысвечаны Сталінскай Канстытуцыі, яе рэальнаму ўвасабленню ў жыццё працоўных нашай рэспублікі.

Што, акрамя гэтага, далі нашы паэты за мінулы год? П. Броўка напісаў паэму «Кацярына» П. Глебкам падрыхтоўваецца зборнік новых вершаў. Такі-ж зборнік падрыхтоўваецца тт. Хведаровічам і Александровічам. Александровіч напісаў дзіцячую казку аб папанінцах. Эдзі Агняцвет напісала паэму «Фелікс Дзержынскі» і падрыхтоўвае паэму аб совецкіх дзяўчатах.

Рад новых вершаў напісан тт. Панчанкам, Ушаковым, Астрэйкам, Шарапавым, Цітовым, Шведзікам, Аксельродам, Лінўшыцам, Целесіным, Боймвол, Груб'янам. Сарай Каган.

М. Калачынскі напісаў кніжку для дзяцей «Косця-чэкіст». А. Куляшоў напісаў паэму аб герою-пагранічніку «Васіль Баранаў», і даў рад новых твораў.

Хвалюючую паэму аб рэволюцыйнай Іспаніі напісаў тав. Жаўрук. Ім-жа напісана і кніжка для дзяцей аб героях-папанінцах. Здадзен у друк верш, прысвечаны юнацкім гадам І. В Сталіна.

Паасобныя празаікі нашы крыху адстаюць, праяўляюць пэўную непаваротнасць, топчуцца часам на месцы, па два, па тры гады не даюць ні аднаго твора. Але гэта не характарызуе агульнага стану нашай мастацкай беларускай прозы. І тут мы маем паасобныя творы, якія робяць гонар усёй нашай беларускай літаратуры. У першую чаргу гэта адносіцца да новага рамана Эдуарда Самуйлёнка «Будучыня». Раман з'явіўся ў выніку паездкі тав. Самуйлёнка ў Грузію і прысвечан працоўным Грузіі, іх гістарычнай барацьбе за сваю сонечную совецкую рэспубліку.

Раман малюе жыццё братняга нам народа, паказвае шмат падзей і з'яў, якія да гэтага часу ніколі яшчэ не бывалі ў нашай літаратуры. Напісан раман сталай рукой спелага майстра. У ім вы не знойдзеце нічога лішняга, нічога непатрэбнага. Не знойдзеце вы тут «развесистой клюквы», той саладжавай «экзотыкі», якая часта з'яўлялася неад'емным атрыбутам кніг аб

Тав. М. Ц. ЛЫНЬКОЎ

усходніх народах. Яркімі фарбамі малюе аўтар грузінскую краіну, стварае высокамастацкія вобразы людзей і параўнаўча добра спраўляецца з фабулай твора, што, як вы ведаеце, у беларускай літаратуры не заўсёды ўдавалася пісьменнікам.

Празаік Кузьма Чорны, аўтар раду раманаў, заканчвае, як вядома, новую п'есу і працуе над новым раманам. З гатовай яго прадукцыі за мінулы год можна ўказаць на два вялікія і цікавыя нарысы, прысвечаныя выбарам у Вярхоўны Совет СССР. Адзін з гэтых нарысаў напісан аб сучаснай Беларусі, другі — аб сталіцы нашай, аб горадзе Менску; аб яго гісторыі, мінулым і цяперашнім жыцці. Нядаўна К. Чорны здаў у друк новае апавяданне «Макаркавых Волька», напісанае на сучасным злабадзённым матэрыяле.

Змітрок Бядуля за апошнія годы быў заняты «Салаўём» — напісаў п'есу «Салавей» і аднайменны сцэнарый для кінофільма. Праўда, па цэламу раду прычын, менш за ўсё залежачых ад аўтара, карціну пасцігнула няўдача. За гэты час Змітрок Бядуля даў нам рад апавяданняў і нарысаў. а цяпер працуе над новай аповесцю «Любоў і нянавісць»—з жыцця нямецкага пролетарыята. Гэта аповесць прысвечана барацьбе нямецкага пролетарыята супроць фашызма. Па тых частках, якія ўжо гатовы і з якімі знаёміў нас аўтар, відаць, што гэта аповесць будзе цікавым і карысным для нас творам.

Заканчвае другую кнігу свайго рамана «Большэвікі граніцы» тав. Шапавалаў. Гэты раман — амаль-што першая кніга ў нашай саюзнай літаратуры, дзе найбольш поўнакроўна паказваецца жыццё слаўных герояў-пагранічнікаў.

Тав. Віцьбіч, якога наша літаратурная грамадскасць упаўне законна папракала ў свой час за цэлы рад ідэйна-палітычных і нацыяналістычных зрываў і прарываў у яго мінулай творчасці, даў рад добрых апавяданняў, напісаных на сучасным матэрыяле. Тав. Віцьбіч працуе цяпер над новай гістарычнай аповесцю на тэму «1812 год на Беларусі».

Тав. Паслядовіч, акрамя нарысаў для кнігі «Грамадзянская вайна ў БССР», напісаў апавяданне «Бікфордаў шнур», друкуе зборнік апавяданняў «Снайпер», зборнік апавяданняў для дзяцей, працуе над п'есай пра совецкую моладзь і над новай аповесцю.

Тав. Шынклер працаваў над матэрыяламі для кнігі «Грамадзянская вайна ў БССР», напісаў нарыс «Магілеў», працуе над аповесцю для дзяцей і аб жыцці чыгуначнікаў напярэдалні 1905 года.

Не кепскі рост паказалі за гэты час маладыя аўтары тт Краўчанка і Кандраценя. Кніга Краўчанкі «На крутым павароце» мае яшчэ рад істотных недахопаў і ў мове і ў кампазіцыі твораў, але ўжо і ў гэтай кнізе, і ў іншых творах, скажам, у п'есе «Торныя дарогі», у апавяданні «На параходзе» мы бачым сур'ёзнага і ўдумлівага мастака, здольнага назіраць і мастацка адлюстроўваць усё бачанае і перажытае ім.

Вельмі ўзрадаваў нас сваёй повесцю «Каханне» малады аўтар тав. Кандраценя. Аповесць «Каханне» тым выгодна вылучаецца сярод нашых твораў, што ў ёй трапна вырашаецца спалучэнне сучаснай тэматыкі з добрым мастацкім паказам, з удалай фабульнай пабудовай. Ад усёй аповесці вее выключнай свежасцю, глыбокай лірычнай цеплынёй, той сапраўднай эмацыянальнай граматнасцю, аб якой пісаў А. М. Горкі ў сваім пісьме да Вс. Іванова, — той граматнасцю, якая дапамагла Кандраценю штодзённыя і звычайныя падзеі ў сучасным калгасным жыцці ўбачыць у люстры тых велічных палітычных падзей, якія адбываюцца ў нашай калгаснай вёсцы і якія гавораць аб велізарнейшых зрухах у свядомасці нашых совецкіх людзей, якія гавораць аб працэсе зжывання перажыткаў капіталізма ў свядомасці людзей.

І тав. Краўчанку і тав. Кандраценю надзвычай важна цяпер не толькі ўтрымацца на заваяваных пазіцыях, але смела рушыць далей. І важнейшая задача стаіць перад імі—задача авалодання культурнай спадчынай мінулага.

Нядрэнны творчы рост маем мы ў тт. Стаховіча і Дзехцяра. Варта ўвагі работа тав. Стаховіча над невялічкімі апавяданнямі, над навелай.

Тав. Дзехцяр напісаў не адно апавяданне з сучаснага рабочага жыцця, працуе зараз над аповесцю «Шаўцы».

Што выгодна вылучае ўсіх нашых маладых аўтароў, увесь калектыў нашай моладзі? Вылучае іх работа над сучаснай тэматыкай, ад якой, прызнацца, нашы паасобныя старэйшыя пісьменнікі калі і не ўхіляюцца, дык якую не так ужо і далюбліваюць часам. Думаю, што наша літаратурная моладзь дапаможа нашым старэйшым пісьменнікам больш шчыльна звязацца з сучасным жыццём, з сучаснай тэматыкай.

Некалькі новых твораў напісалі т.т. Глазырын і Садоўскі.

Ёсць безумоўныя поспехі і ў нашай літаратуры для дзяцей. Асноўным поспехам з'яўляецца ўжо тое, што да невялічкага калектыва Янка Маўр—Якімовіч далучыўся цэлы рад пісьменнікаў, якія звычайна пішуць для дарослых. І Янка Купала, і Якуб Колас, і Бядуля, і Александровіч, і Жаўрук, Калачынскі, Левановіч, Шынклер, Краўчанка і рад іншых таварышоў напісалі і пішуць кнігі для нашых дзяцей.

Я. Маўр напісаў сцэнарый для дзіцячага фільма «Сардэчны падарунак», цяпер піша пад гэтай назвай і аповесць. Тав. Якімовіч напісаў для дзяцей кніжкі «Залаты зуб», «Казка пра смелага вожыка», «Выпадак на чыгунцы», кнігу для дашкольнікаў «Нашы знаёмыя» працуе над кнігай для дзяцей на матэрыяле з жыцця працоўных Заходняй Беларусі.

Што можна сказаць аб калектыве нашых крытыкаў. Мы можам пералічыць рад артыкулаў Клімковіча, Кучара, Вольскага, Бярозкіна, Шарахоўскага, Ляпіча, Модэля, Ларчэнкі і іншых таварышоў па раду самых рознастайных пытанняў. Тут і аб'ёмісты нарыс «Беларуская літаратура за 20 год» Кучара і Вольскага, якія зрабілі спробу падагуліць здабыткі нашай літаратуры, вызначыць асноўныя этапы яе развіцця. Нарыс пісаўся ва ўдарным парадку, не пазбаўлен значных недахопаў і часам не зусім правільных ацэнак паасобных літаратурных з'яў. Уласцівы яму і тыя грахі, якія адзначаны ў некаторых аналагічных артыкулах юбілейнага парадку ў рускай літаратуры,—павярхоўнасць, сякія-такія адзнакі старых кананізаваных «абоймаў», забыццё на маладую парасль — таленавітую нашу моладзь.

Варта ўказаць на артыкулы тав. Вольскага аб Пане, артыкулы Кучара аб творчасці Якуба Коласа, Броўкі, Чорнага, артыкулы Бярозкіна аб Маякоўскім, Пушкіне, аб Аксельродзе, Куляшове і інш., артыкулы Шарахоўскага аб Некрасаве, Белінскім, Пушкіне, Маякоўскім, Горкім, аб Янку Купале, аб лірыцы Якуба Коласа і іншыя.

Нашы крытыкі, як калектыў, як крытычная секцыя нашай літаратурнай арганізацыі, зрабілі ўсё-ж такі надзвычай мала. Вінаваты яны перш за ўсё ў тым, што не праявілі, як крытыкі, належнай пільнасці ў своечасовым выкрыцці ворагаў народа ў непасрэдных «літаратурных» практыкаваннях гэтых ворагаў.

Цяпер перад нашымі крытыкамі самае шырокае поле дзейнасці. Акрамя ацэнкі сучасных літаратурных з'яў, перад імі стаіць пачэсная задача азнаямлення нашай пролетарскай грамадскасці з культурнай спадчынай і, урэшце, чыста практычныя задачы, якія мы ставім перад нашымі крытыкамі: дапамагчы Акадэміі навук БССР напісаць гісторыю беларускай літаратуры, дапамагчы Наркамату асветы даць нашым вучням талковы падручнік па літаратуры.

І яшчэ адна важная задача стаіць перад калектывам нашых крытыкаў,—гэта—усямерная актывізацыя сваёй работы, бо, трэба сказаць, частка нашых крытыкаў не так ужо актыўна ўдзельнічае ў літаратурным і грамадскім жыцці.

Велізарная работа, прычым яўна недаацэньваемая, праведзена нашымі празаікамі і паэтамі па перакладу лепшых твораў рускай і іншых братніх літаратур на беларускую мову.

Так выглядаюць бясспрэчныя поспехі і здабыткі нашай літаратурнай арганізацыі за мінулы справаздачны год. Яны не такія ўжо і дрэнныя. Але ў нас паўстае пытанне такога парадку: ці з'явіліся ўсе гэтыя бясспрэчныя поспехі ў выніку добра наладжанай работы праўлення нашага саюза добра наладжанай творчай работы ўнутры самой літаратурнай арганізацыі? І трэба сказаць, што асноўнай прычынай усіх нашых поспехаў, усіх нашых безумоўных дасягненняў, безумоўнай творчай актывізацыі нашых радоў з'яўляецца ачышчэнне літаратурнай арганізацыі ад усякай трацкісцка-бухарынскай і нацыянал-фашысцкай погані. Гэта аздаравіла атмасферу, пазбавіла нас ад таго смуроднага павучыння, якім форменным чынам аблытвалі нашы рады ворагі. Але мы былі-б пустымі балбатунамі, калі-б заявілі, што ворагі выкрыты канчаткова, што мы выгналі іх з нашых радоў. Дабрадушнічаць нам часу яшчэ няма, спачываць на лаўрах мы ніякага права не маем.

Пагаворым аб нашых недахопах, аб усіх тых перашкодах, прарывах, аб усіх тых памылках, наогул аб усім тым, што перашкаджае яшчэ нашай нармальнай творчай рабоце, што перашкаджае часам нармальнаму развіццю ўсёй нашай літаратуры. Існуе ў нас нездавальненне пісьменнікаў работай праўлення, нездавальненне ўпаўне законнае, якое мае пад сабой і шматлікія падставы.

Перш за ўсё, ёсць нездавальненне тым, што праўленне не ўдзяляла патрэбнай увагі непасрэдным творчым пытанням, што саюз ператвараўся часам у літаратурную канцылярыю, у дэпартамент ад літаратуры замест таго, каб быць жывой творчай арганізацыяй.

Гэта мае пад сабой падставы: пытанні творчай работы не карысталіся належнай увагай з боку праўлення. Разбяромся талкова ў гэтай справе. Ці аддавалі мы ўвагу творчасці нашых пісьменнікаў? Звярталі ўвагу, і немалую, здаецца, але справа ў тым, што ўся гэта работа мела негатыўны характар. Мы даволі грунтоўна і даволі дакладна пазнаёміліся з творчасцю паасобных пісьменнікаў, але пазнаёміліся мы, у першую чаргу, з іх адмоўнай творчасцю, з іх недахопамі, самымі рознастайнымі зрывамі, а часам з тымі ці іншымі адмоўнымі ўчынкамі паасобных людзей. Прывяду рад прыкладаў такога парадку.

Хіба мы з вамі,—і праўленне, і ўвесь наш літаратурны калектыў, уся наша літаратурная грамадскасць, — хіба мы мала знаёміліся з творчасцю такіх людзей, якія потым былі выкрыты як заклятыя ворагі народа. Хіба няўважліва мы аднесліся да шкодных элементаў і паасобных зрываў у творчасці такіх пісьменнікаў, як Шведзік, Мальцінскі, Платнер і рад іншых?

Хіба мы мала займаліся ў мінулым годзе творчасцю Андрэя Александровіча? Кожны радок яго твораў—і позніх і ранніх быў прапушчан намі праз частае сіта большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі. І ніхто не будзе адмаўляць, што гэта справа не прынесла нам усім, нашаму пісьменніцкаму калектыву, усёй нашай беларускай совецкай літаратуры, а ў тым ліку і самому Александровічу, вялікую карысць? Усё гэта прымусіла Александровіча, як паэта, як грамадзяніна, самым сур'ёзным чынам перадумаць свой творчы шлях, самым уважлівым чынам перадумаць усю мінулую творчую і грамадскую дзейнасць. Александровіч зараз працуе куды больш уважліва і дае нам лепшыя творы, чым даваў раней. Александровіча мы адзёрнулі як належыць, мы паставілі яго на правільную дарогу.

Мы можам гаварыць аб яўнай небяспецы адрыву ад жыцця для некаторых нашых паасобных пісьменнікаў, людзей, якія маюць літаратурнае імя, маюць нядрэнныя творы, але ўся бягучая творчая работа якіх звязана з мінулым, з ранейшымі назіраннямі, уражаннямі маладосці і г. д. Перад імі востра стаіць пытанне папаўнення свайго запасу назіранняў, што немагчыма без арганічнай сувязі з сучасным жыццём, з жыццём нашых рабочых, нашых калгаснікаў. Тут трэба прыгадаць мудрыя словы Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна:

«У древних греков в системе их мифологии был один знаменитый герой—Антей, который был, как повествует мифология, сыном Посейдона—бога морей и Геи—богини земли. Он питал особую привязанность к матери своей, которая его родила, вскормила и воспитала. Не было такого героя, которого-бы он не победил, этот Антей. Он считался непобедимым героем. В чем состояла яго сила? Она состояла в том, что каждый раз, когда ему в борьбе с противником приходилось туго, он прикасался к земле, к своей матери, которая родила и вскормила его, и получал новую силу. Но у него было все-таки свое слабое место — это опасность быть каким-либо образом оторванным от земли. Враги учитывали эту его слабость и подкарауливали его. И вот нашелся враг, который использовал эту его слабость и победил его. Это бог Геркулес. Но как он его победил? Он оторвал его от земли, поднял на воздух, отнял у него возможность прикоснуться к земле и задушил его таким образом в воздухе».

Гэтыя словы адрасаваны таварышам Сталіным да нашых большэвікоў, да членаў вялікай комуністычнай партыі, гавораць аб іх сувязі з народнымі шырокімі масамі. Гэтыя словы ў аднолькавай ступені адносяцца і да нас, да совецкіх пісьменнікаў. Не будзеш мець арганічнай сувязі з народам, цябе парадзіўшым,—грош цана будзе тваёй рабоце, яна будзе нікому і нінавошта непатрэбнай...

Таварыш Сталін назваў совецкіх пісьменнікаў «інжынерамі чалавечых душ». Насіць па-праву гэту годнасць можа толькі перадавы чалавек сваёй эпохі, чалавек, які ведае жыццё, звязан з ім і актыўна ў ім удзельнічае.

Пісьменнік павінен быць арганічна звязан з жыццём свайго народа.

Якія недахопы яшчэ не выжыты ў нашай літаратурнай арганізацыі?

Трэба сказаць, што ў нас не ўсё яшчэ добра ва ўзаемаадносінах пісьменнікаў-комуністаў і пісьменнікаў беспартыйных. Тут патрабуецца вялікая работа, каб наладзіць сумесную дружную творчую работу.

Тут у першую чаргу вінаваты мы—комуністы, што ў свой час сёе-тое прагледзелі, не арганізавалі работу сярод беспартыйных таварышоў, не арганізавалі групу спачуваючых, не арганізавалі адкрытых сходаў і г. д. Тут наша бясспрэчная віна. А трэба памятаць, што ўсе нашы промахі скарыстоўваюцца ворагамі, якія яшчэ не выкрыты да канца ў нашым літаратурным асяроддзі і сям-там спрабуюць атручваць атмасферу ў нашай літаратурнай арганізацыі.

Я не сказаў-бы, што ў нас да канца выкрыты і элементы групаўшчыны. Маюць месца паасобныя рэцыдывы паганай багемы, у прыватнасці у тав. Шарапава.

Багата ў нас недахопаў і ў рабоце з літаратурнай моладдзю, з нашымі падрастаючымі кадрамі. Праўда, мы маем тут некаторыя зрухі, некаторы пералом. Мы прынялі ў саюз групу здольнай, таленавітай моладзі. Прымалі досыць уважліва, прад'яўляючы да людзей сур'ёзныя патрабаванні і ў сэнсе іх мастацкай падрыхтаванасці і ў сэнсе наогул іх ідэйна-грамадскага аблічча. Ёсць у нас рад здольных аўтароў, як паэты Дзядзюля. Сасноўскі. Шахавец, Крот, Хадарэнка, Няхай, Матэвушаў, Шурлака, Раманішка, Круцілаў і інш. Многія з гэтых таварышаў друкаваліся ў нашых журналах і газетах.

Але мы не можам сказаць, што наш габінет маладога аўтара працуе добра. Вузкія маштабы яго работы. Патрэбны выезды на месцы, хоць-бы ў буйнейшыя нашы гарады. Недастаткова прыцягваюцца кваліфікаваныя пісьменнікі для работы з маладымі аўтарамі ў самым габінеце. Ёсць яўная недаацэнка работы з маладымі кадрамі з боку кваліфікаваных пісьменнікаў. У наяўнасці факты безадказных адносін старэйшых пісьменнікаў да творчасці маладых таварышоў. Яны выражаюцца часам у беспадстаўным захвальванні сырых, слабых твораў пачынаючых таварышоў.

Якія задачы стаяць перад нашай літаратурнай арганізацыяй

Тут перад вамі вісіць лозунг са словамі таварыша Сталіна: «Трэба ўвесь наш народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не змаглі засцігнуць нас знянацку».

Гэта вялікія словы. Яны яшчэ раз напамінаюць нам аб капіталістычным абкружэнні, яны яшчэ раз гавораць нам аб неабходнасці выключнай палітычнай пільнасці да проіскаў ворагаў, аб неабходнасці мабілізацыі ўсіх нашых сіл і сродкаў супроць нападаў і пасяганняў, якія штодня рыхтуюць нам падонкі чалавецтва, агалцелыя фашысты і іх брудныя найміты—прадажныя сабакі з трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх банд. Словы правадыра заклікаюць нас да стварэння баявой абароннай літаратуры.

Як адну з асноўных задач у жыцці і рабоце нашай літаратурнай арганізацыі трэба паставіць задачу авалодання і асваення ўсіх вялікіх багаццяў марксісцка-ленінскай навукі, марксісцка-ленінскага вучэння.

Усю асноўную нашу ўвагу ў рабоце і праўлення і наогул усёй літаратурнай арганізацыі мы павінны звярнуць на непасрэдную творчую работу, на стварэнне высокаідэйнай і высокамастацкай літаратуры, прасякнутай духам большэвізма, духам непрымірымасці да ворагаў, вялікай ненавісці да іх,—літаратуры, якую мы па-праву называлі-б народнай літаратурай, якую-б любіў наш совецкі народ, якая-б адпавядала ідэям і імкненням гераічнага совецкага народа, якая-б выражала найлепшыя, перадавыя ідэі чалавецтва, ідэі барацьбы за комунізм.

Выключную увагу мы павінны звярнуць на сучасную тэматыку, на напісанне твораў на матэрыялах сучаснага жыцця.

Наша барацьба за высокую ідэйную і мастацкую якасць літаратуры можа ісці толькі на аснове чэснай прынцыповай крытыкі і самакрытыкі, не пазіраючы ні на якія асобы, і гэту лінію мы паложым у аснову ўсёй нашай работы.

Вялікая задача стаіць перад нашай літаратурнай арганізацыяй у сувязі з правядзеннем не ў такім далёкім часе дэкады беларускага совецкага мастацтва ў Маскве.

Прадстаіць яшчэ вялікая работа па далейшаму цэментаванню непарушнасці блока комуністаў-пісьменнікаў і пісьменнікаў беспартыйных.

Цэлы рад задач паўстае перад намі ў справе асваення нашай культурнай спадчыны, вывучэння гісторыі нашага народа.

Смелае высоўванне моладзі, сталая сур'ёзная работа з ёю—і літаратурна-творчая і палітычна-выхаваўчая—адна з важнейшых задач.

Мы праводзім пленум у дні падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Мы правялі нядрэнную работу ў часе падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Пастараемся-ж цяпер, улічыўшы набыты вопыт, яшчэ лепш, яшчэ больш арганізавана, чым у мінулы час, прыняць удзел у выбарах у Вярхоўны Совет БССР, у першы соцыялістычны парламент нашай рэспублікі.

Нашы паэты пішуць песні, гімны аб Сталінскай Канстытуцыі. Частка пісьменнікаў удзельнічала ў напісанні кнігі «Совецкая Беларусь», драматургі напісалі некалькі аднаактных п'ес, прысвечаных выбарам. Мы ўсе будзем пісаць нарысы аб кандыдатах у дэпутаты. Паэты будуць выступаць цэлымі брыгадамі на перадвыбарчых сходах. Мы пашлем брыгады пісьменнікаў у раёны для правядзення належнай масава-агітацыйнай, прапагандысцкай работы перад выбарамі. Частка таварышоў ужо зараз працуе агітатарамі на ўчастках.

Пленум павінен заклікаць усіх пісьменнікаў аддаць усе сілы, усе свае мастацкія здольнасці справе канкрэтнага ўвасаблення Сталінскай Канстытуцыі ў жыццё працоўных беларускага народа.

Няхай-жа жыве баявая комуністычная партыя—арганізатар нашых перамог і дасягненняў.

Няхай жыве найвялікшы чалавек нашай эпохі, геніяльны кіраўнік і правадыр нашай радзімы, Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

---

*) Скарочаная стэнаграма.

ДЗЕННІК ПЛЕНУМА ССП БССР

(КАНЕЦ. ПАЧАТАК ГЛ. НА 1-ай СТАР).

Тав. **Цітоў** указвае на недахопы работы рускай секцыі і секцыі абароннай літаратуры. Абодвы секцыі не працуюць, бо кіраўнік іх тав. Шапавалаў перагружан іншай работай і не можа аддаць гэтай справе больш часу. Ёсць недахопы і ў рабоце літаратурнага габінета, асабліва нездавальняюча працуе кансультант па прозе тав. Модэль, у стале якога вялікія залежы непрачытаных рукапісаў.

Слова атрымлівае тав. **Бядуля.** Ён згаджаецца з дакладчыкам, што старэйшыя пісьменнікі некалькі адарваліся ад сучаснасці. — Безумоўна, — кажа тав. Бядуля, — вечна карыстацца толькі ўспамінамі маладосці і ўяўляць сучаснасць паводле таго, як калісьці было, і смактаць з пальца — нельга.— Гаворачы аб рабоце з маладымі пісьменнікамі, тав. Бядуля прапануе аказваць пачынаючым аўтарам больш канкрэтнай дапамогі.

Тав. **Сярэбраны** ўказвае, што работа з яўрэйскімі пісьменнікамі ў ССП пастаўлена слаба.

Тав. **Стаховіч** звяртае ўвагу пленума на тое, што ачыстка літаратурнай арганізацыі ад варожага ахвосця яшчэ не скончана, што трэба ўзняць яшчэ вышэй большэвіцкую пільнасць, каб канчаткова дабіць варожыя рэшткі. Тав. Стаховіч указвае на важнейшыя недахопы работы праўлення ССПБ: адсутнасць належнай увагі да творчых пытанняў, адсутнасць дапамогі пісьменніку, увагі да пытанняў работы секцыі, неналаджанасць сувязі пісьменнікаў з масамі.

Тав. **Чорны** адзначае, што на розных участках будаўніцтва соцыялістычнай культуры ёсць яшчэ недахопы, да якіх праўленне ССП і Саюз пісьменнікаў у цэлым адносяцца недастаткова ўважліва. Напрыклад, у Пединстытуце доўгі час прапаведвалі раппаўскія ўстаноўкі ў выкладанні літаратуры. Аб гэтым гаварылі некалькі год і толькі цяпер гэта выяўлена.

Тав. **Якімовіч** указвае, як на недахоп, на адсутнасць у павестцы дня пленума пытанняў дзіцячай літаратуры. За апошнія годы, асабліва за апошні год у дзіцячай літаратуры паявіліся новыя творы, новыя аўтары. Праўда, гэтых дасягненняў магло быць у шмат разоў больш, калі-б праўленне саюза і асобныя пісьменнікі больш цікавіліся дзіцячай літаратурай.

Тав. **Гурскі** адзначае, што дасягненні ў нашай літаратуры, аб якіх гаварыў тав. Лынькоў, не з'явіліся ў выніку самацёку, а ў выніку работы праўлення саюза, партыйнай арганізацыі, у выніку кіраўніцтва ЦК партыі, які ўдзяляе надзвычай вялікую ўвагу пытанням літаратуры. Але на гэтым пленуме трэба ў першую чаргу гаварыць аб недахопах. Асноўны недахоп работы праўлення саюза — адсутнасць планавання тэматыкі, чым і тлумачыцца адсутнасць твораў аб росце беларускага рабочага класа, твораў аб новай вёсцы, аб утварэнні БССР і ўдзеле ў гэтай справе таварыша Сталіна, аб рабоце ў Беларусі тт. Фрунзе, Кагановіча, Ежова, Орджанікідзе. А ў нас ёсць сілы, ёсць мастакі слова, якія могуць узняць гэтыя тэмы.

Далей тав. Гурскі напамінае аб дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве ў будучым годзе. Трэба будзе павезці ў Маскву дзве-тры арыгінальныя оперы, дзве-тры арыгінальныя п'есы. Аднак падрыхтоўка рэпертуару для нашых тэатраў ідзе слаба. Дрэнна працуюць секцыі — паэтычная, драматургічная, празаікаў і крытыкаў.

Тав. Гурскі спыняецца на рабоце газеты «Літаратура і мастацтва», у якой ёсць рад недахопаў, а часамі памылак палітычнага парадку. — Мы яшчэ не навучыліся, — кажа тав. Гурскі, — працаваць так, як працуе наша лепшая газета «Праўда».

Тав. **Шарапаў** спыняецца на тэматычнай аднастайнасці раду твораў. Тэмы нашых твораў — імперыялістычная вайна, белапольская акупацыя. Аб сённяшніх днях нашай соцыялістычнай эпохі кніг вельмі мала. Прычына гэтага ў адсутнасці штодзённай палітыка-выхаваўчай работы з пісьменнікамі, у адсутнасці канкрэтнай творчай дапамогі праўлення саюза пісьменнікам, у недастатковай сувязі пісьменніка з жыццём.

Тав. **Хведаровіч** ставіць пытанне аб дзейснасці пасяджэнняў праўлення саюза. Процантаў на 60 канкрэтныя прапановы і планы звычайна не выконваюцца. Метады кіраўніцтва праўлення саюза пісьменнікаў устарэлі. Пасяджэнні праўлення праходзяць вяла. Час падумаць аб новых метадах работы.

***

На вячэрнім пасяджэнні пленума 11 мая прадаўжаліся спрэчкі па дакладу тав. Лынькова. У спрэчках выступілі тт. **Клімковіч, Калачынскі, Гарбуноў, Дашкевіч, Круцілаў.**

***

12 мая на ранішнім пасяджэнні прадаўжаліся спрэчкі па дакладу тав. Лынькова. Выступілі тт. **Аксельрод, Мальцінскі і Гарэлік.** На гэтым спрэчкі па дакладу тав. Лынькова былі спынены.

Пленум абраў камісію з пяці чалавек для падрыхтоўкі праекта рэзалюцыі па дакладу тав. Лынькова.

Пасля гэтага пленум заслухаў даклады: тав. **Кучара** — аб зборніку вершаў народнага паэта Янкі Купалы «Беларусі ордэнаноснай», тав. **Аксельрода** — аб творы тав. Фінкеля «Мендэле Мойхер Сфорым», тав. **Клімковіча** — аб п'есе народнага паэта Якуба Коласа «У пушчах Палесся» і тав. **Гурскага** — аб п'есе М. Клімковіча «Кацярына Жарнасек».

***

Ранішняе пасяджэнне 13 мая пачынаецца дакладам тав. **Вольскага** аб п'есе К. Крапівы «Партызаны». Потым пленум заслухоўвае даклад тав. **Броўкі** аб творчасці маладога паэта П. Панчанкі. Па просьбе членаў прэзідыума тав. Панчанка выходзіць на трыбуну і чытае свае апошнія вершы. Тав. Лынькоў паведамляе, што паступіла прапанова перавесці тав. Панчанку з кандыдатаў у члены Саюза совецкіх пісьменнікаў. Прапанова прымаецца аднагалосна.

Потым пленум заслухоўвае апошні даклад — тав. **Чорнага** аб творчасці маладога празаіка У. Кандрацені. Тав. Кандрацені таксама аднагалосна пераводзіцца з кандыдатаў у члены ССПБ.

Пачынаюцца спрэчкі па ўсіх творчых дакладах. На ранішнім пасяджэнні паспелі выступіць тт. **Сара Каган, Краўчанка, Клімковіч, Груб'ян, Фінкель, Куляшоў, Ольшэўская.**

У канцы пасяджэння пленум зацвярджае адказ саюза совецкіх пісьменнікаў на пісьмо калгаса імя Чапаева, Золатаношскага раёна Палтаўскай вобласці, адрасаваны калгаснікам і ўсім працоўным Совецкай Беларусі, у якім чапаеўцы заклікаюць усіх працоўных Беларусі ўзорна правесці выбары ў Вярхоўны Совет БССР (пісьмо чапаеўцаў надрукавана ў «Звяздзе» ад 11 мая).

***

На вячэрнім пасяджэнні 13 мая пачаліся спрэчкі па ўсіх творчых дакладах. З прамовамі выступілі тт. **Сярэбраны, Бярозкін, Кручкін, Дзехцяр і Глебка.**

На ранішнім пасяджэнні пленума 14 мая прадаўжаліся спрэчкі па творчых дакладах. Выступілі тт. **Александровіч, Дорскі, Кучар, Шапавалаў, Броўка, Юдэлевіч, Крапіва.**

На вячэрнім пасяджэнні, пасля выступленняў тт. **Куляшова, Агняцвет і Клімковіча,** спрэчкі па творчых дакладах былі спынены.

Пасля гэтага з дакладам аб задачах пісьменнікаў у падрыхтоўцы і правядзенні выбараў у Вярхоўны Совет БССР выступіў выконваючы абавязкі старшыні ЦВК БССР тав. **Наталевіч.** На гэту-ж тэму выступіў тав. **М. Лынькоў.**

Вячэрняе пасяджэнне 14 мая закончылася выступленнямі паэтаў **Якуба Коласа, Крапівы, Шапавалава, Глебкі, Рэйзіна, Агняцвет, Александровіча, Журбы, Целесіна, Панчанкі, Куляшова, Хведаровіча, Сары Каган і Броўкі,** якія прачыталі свае вершы, прысвечаныя выбарам у Вярхоўны Совет, Сталінскай Канстытуцыі і светламу раДаснаму жыццю народаў Совецкага Саюза.

15 мая раніцою на апошнім пасяджэнні пленума пачаліся спрэчкі па дакладу тав. **Наталевіча.** У іх прынялі ўдзел тт. **Калачынскі, Сярэбраны, Платнер, Рудзько, Целесін, Журба, Гурскі.** На гэтым пасяджэнні выступіў з прамовай в. а. сакратара ЦК КП(б)Б тав. **А. М. Лявіцкі.** На гэтым спрэчкі па дакладу тав. Наталевіча былі спынены.

Пасля прыняцця рэзалюцый па дакладах тав. Наталевіча і тав. Лынькова пленум сваю работу закончыў.

ТЭАТР „РОМЭН“

(Да гастроляй у Менску)

Маскоўскі дзяржаўны цыганскі тэатр «Ромэн» існуе ўжо сем год. Гэта адзіны цыганскі тэатр у свеце і яго існаванне, работа і развіццё — яркае сведчанне велізарных перамог ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Тэатр «Ромэн» нарадзіўся ў вельмі цяжкіх умовах. Не было ні цыганскіх актораў, ні рэжысёраў, ні п'ес. Актораў — цыганоў, паступіўшых у тэатр проста з табара альбо цыганскіх хораў, прыходзілася навучаць не толькі сцэнічнаму майстэрству, але і элементарнай грамаце. Заняткі па агульна-адукацыйных дысцыплінах чаргаваліся з рэпетыцыямі.

Для стварэння сваёй драматургіі тэатр сабраў вакол сябе блізкіх да літаратуры цыганоў. У тэатра паявіліся свае драматургі — акторы, з'явіліся свае п'есы. Зараз у тэатра ёсць свой рэпертуарны багаж, свой моцна спаяны творчы калектыў.

Асноўная палітычная задача тэатра— барацьба сродкамі мастацкай прапаганды за пераход цыганоў ад вандроўнага да аселага жыцця. Мастацкая задача тэатра — азнаямленне шырокіх мас працоўных з узорамі сапраўды народнай творчасці цыганоў шляхам барацьбы з так-званай «цыганшчынай», з мастацтвам буржуазных кафе-шантанаў.

Тэатр «Ромэн» настолькі вырас, развіўся і ўмацаваўся, што стварыў такі адказны спектакль, як «Цыганы» паводле А. С. Пушкіна, спектакль, атрымаўшы станоўчую ацэнку аўтарытэтных майстроў тэатра і літаратуры.

Апрача «Цыганаў» у рэпертуары тэатра п'есы — «Жыццё на калёсах» А. Германо, «Вяселле ў табары» — Ром-Лебедзева, «Кармен» (паводле Мерымэ) — О. Кузьмінскай, «Дачка стэпаў» — Ром-Лебедзева і «Вечар цыганскай песні і пляскі» у пастаноўцы засл. арт. рэсп. ордэнаносца М. М. Яншына.

Выходзячы з самой прыроды цыганскага нацыянальнага мастацтва, амаль дагэтуль нескарыстанага, тэатр будуе свае спектаклі сінтэтычна, уключаючы ў іх усе элементы тэатральнага мастацтва (музыка, пляскі, эпас і г. д.).

Увосень 1937 года тэатр удзельнічаў у пятым тэатральным фестывалі ў Маскве і атрымаў бліскучую ацэнку совецкай прэсы і зарубежных гасцей.

Зараз тэатр працуе над п'есай Ром-Лебедзева «Радзіма», а таксама над п'есай «Крывавае вяселле» — маладога іспанскага драматурга Гарсія Лорка, зверска расстралянага падручнымі ката Франко.

Тэатр «Ромэн» пачаў свае гастролі ў БССР 5 мая ў Бабруйску. 17 мая тэатр пастаноўкай «Цыганы» пачынае свае гастролі ў Менску. Потым тэатр наведае Магілеў і Гомель. Усяго тэатр «Ромэн» дасць у БССР каля 60 спектакляў.

Р. Б.

АКТОРЫ АБ СВАЁЙ РАБОЦЕ НАД СПЕКТАКЛЕМ „ПАРТЫЗАНЫ“

Удзячны матэрыял

Я даўно марыў аб ролі маладога хлопца ў перыяд грамадзянскай вайны. Нажаль, гэта тэма ў нашым тэатры была вельмі мала прадстаўлена. І вось я атрымліваю ролю, больш значную, чым тая, аб якой я марыў. Гэта не проста малады хлапец, удзельнік барацьбы, а кіраўнік атрада партызан, іх натхніцель і начальнік. Калі я атрымаў ролю Данілы Дрыля, гэта мяне нават крыху спужала. Я не быў упэўнены ў тым, што змагу яе сыграць, але матэрыял п'есы захапіў з першых рэпетыцый і я пачаў упэўнівацца ў сваіх сілах і палюбіў свой вобраз.

Чаго я дасягнуў у сваёй рабоце, скажа наш глядач — самы галоўны і пачэсны рэцэнзент. Вядома, ролю трэба яшчэ дапрацоўваць, адчуваюцца многія мясціны, якія мяне, як актора, не задавольваюць.

Матэрыял п'есы патрабаваў і ад нас, актораў, і ад рэжысёра прастаты, гранічнай жыццёвасці. Гэта ў спектаклі, мне здаецца, дасягнута.

Мы чакаем новых п'ес ад Кандрата Крапівы.

П. ПЕКУР.

Простымі і пераканаўчымі сродкамі

У спектаклі «Партызаны» мне асабіста выпала цяжкая і адказная работа: праз вобраз Скібы, якога я іграю, паказаць, якую велізарную работу праводзіла партыя большэвікоў па арганізацыі партызанскага руху.

Скіба — палітычны камісар адной з дывізій Чырвонай Арміі на польскім фронце. Чырвоныя адступаюць, але большэвікі павінны пакінуць у белапалякаў «моцны» тыл. Фронт устанавіўся. Скіба ў тылу ў белапалякаў арганізуе сялян, кіруе партызанамі. Нарэшце, Скіба — ваенны камісар.

Маёй акторскай задачай было: простымі, пераканаўчымі сродкамі паказаць гэтага большэвіка так, каб яму давяралі сяляне, каб яму верыў глядач, каб у скупых словах рэволюцыі адчувалася вялікае напружанне сіл для таго, каб магутным ударам выбіць усю панскую нечысць, якая зрабіла спробу акупіраваць Совецкую Беларусь.

Калі мне, актору, удалося ажыццявіць свае акторскія задачы ў гэтым спектаклі, — я буду шчаслівы. Але аб гэтым будзе меркаваць наш глядач.

В. КРАУЦОЎ.

РАБОТА НАД ВОБРАЗАМ ДЗЕДА БАДЫЛЯ

Два месяцы таму назад я атрымаў адну з цэнтральных ролей п'есы «Партызаны» К. К. Крапівы. Да гэтага часу ў Белдзяржрдрамтэатры я іграў эпізадычныя ролі і, павінен сказаць па праўдзе, я імі быў вельмі задаволены.

Атрымаўшы ў спектаклі «Партызаны» вялікую цэнтральную ролю—ролю дзеда Бадыля, дарэчы добра напісаную аўтарам, я лічыў сваім абавязкам аддаць ёй усю ўвагу, усе магчымасці.

Дзед Бадыль—селянін, які быў пад прыгонам, пад бізуном паноў і толькі пад старасць вольна ўздыхнуў пры совецкай уладзе.

Калі белапольскія банды акупіравалі Совецкую Беларусь, калі зноў вярнуліся польскія паны і пачалі секці бізунамі сялянскія спіны, дзед Бадыль прымае ўдзел у партызанскім руху. Ён просіць, каб яму далі заданне. Ён хоча быць карысным у партызанскім атрадзе. Яму даюць даручэнне правесці Чырвоную Армію ў тыл палякам, што ён і робіць.

Мне над гэтай роллю прышлося шмат папрацаваць і яшчэ я сам адчуваю, што не ўсё зроблена. Аўтарам п'есы вобраз дзеда Бадыля акрэслен вельмі добра. Прада мною стаяла задача поўнасцю раскрыць замысел аўтара. Для гэтага я ўдумліва вывучыў тэкст, пазнаючы думкі дзеда Бадыля, яго настроі, мары і жаданні. Мне дапамаглі ў гэтым літаратура, гутаркі з старымі калгаснікамі.

А. БАРАНОЎСКІ.

Вобраз перажыванняў

Вобраз Рыгора — адзін з асноўных вобразаў п'есы «Партызаны» — мяне захапляе глыбінёй пачуццяў, народнасцю і прастатой. Праз вялікія перажыванні і асабістыя супярэчнасці Рыгор прыходзіць да партызанаў і становіцца актыўным барацьбітом з панамі.

Рыгор кахае Кацярыну, дачку заможнага кулака Маргуна. Гэта каханне засланіла Рыгору свет, ён толькі адну яе, Кацярыну, бачыць у сваіх марах, і без яе ён не бачыць сэнсу жыцця. Не дапамагаюць ніякія ўгаворы таварышоў, у прыватнасці Данілы, яго сябра.

Кацярына абяцае выйсці за Рыгора замуж толькі тады, калі ён разбагацее. І ў пэўны момант яна дае яму нож у рукі, каб ён забіў Данілу, камандзіра партызанскага атрада, галаву якога палякі ацанілі ў 15 тысяч марак.

Рыгор у апошні момант працвярозіўся ад свайго сляпога кахання. Ён зразумеў, каго ён забівае для выгоды панам. Ён зразумеў, што быў абкручан ворагамі народа. Кацярыне патрэбны былі галава Данілы і грошы, а не каханне бедняка Рыгора. І Рыгор забівае сваю каханую.

З вялікім напружаннем і хваляваннем імкнуўся я, як мага лепш, па-сапраўднаму данесці да гледача ў вобразе Рыгора любоў да жыцця, да барацьбы. Драматургічны матэрыял даў магчымасць глыбока разгарнуць акторскую работу над вобразам, чаго так часта нехапае акторам у драматычных творах.

Хочацца заўсёды мець такі драматычны твор для работы, працуючы над якім, мог-бы аддаць усе свае сілы і здольнасці для росквіту соцыялістычнага мастацтва нашай шчаслівай радзімы.

І. ШАЦІЛА.

Група выдатнікаў Гомельскай музычнай школы па класу пяніна. Злева направа: Каганова, Файнберг, Шыфчык, Якубовіч і Вігдорчык; ля раяля — Крычэўская.

Фото І. Рабіновіча.

Аб выхаванні маладых кадраў

Маладыя акторы патрабуюць большай увагі

У артыкуле тав. Кучара прыведзены факты дрэннай работы па творчаму выхаванню маладых актораў у Дзяржаўным Віцебскім тэатры. Падобныя факты можна прывесці і з практыкі работы Дзяржаўнага Беларускага драматычнага тэатра.

Існаваўшая пры тэатры студыя закончыла сваю работу 1 студзеня 1938 года. Пасля паказу выпускнога спектакля «Слуга двух паноў» Гальдоні (пастаўлен выкладчыкам акторскага майстэрства ў студыі—засл. арт. рэсп. Л. М. Літвінавым), які быў добра прынят грамадскасцю, загадам Упраўлення па справах мастацтваў усе студыйцы, 10 чалавек, пакінуты ў Белдзяржрдрамтэатры ў якасці актораў-стажораў. Адначасова для далейшай работы з маладымі акторамі была намечана пастаноўка камедыі А. Н. Астроўскага «Беднасць не загана».

Не гледзячы на тое, што кіраўніцтва тэатра само дамагалася, каб скончыўшых студыю пакінуць пры тэатры, маладыя акторы вельмі хутка адчулі, што да іх адносяцца не так, як належыць.

Па-першае, ніякай творчай вучобы з былымі студыйцамі, як і з астатняй моладдзю тэатра, не вядзецца. За некалькі месяцаў адбылося ўсяго чатыры рэпетыцыі камедыі А. Н. Астроўскага. Па-другое, студыя існавала без адрыву ад вытворчасці і таму ў творчым выхаванні студыйцаў ёсць цэлы рад прабелаў, якія трэба ў далейшай практычнай працы ліквідаваць. Асабліва вялікае значэнне зараз мае прызначэнне пастаноўшчыка камедыі «Беднасць не загана», бо работа над пастаноўкай павінна быць спалучана з вялікай творчай вучобай. Пастаноўшчыкамі вызначаны акторы тэатра, якія маюць акторскую, але не маюць амаль ніякай рэжысёрскай практыкі. Вывучэнне маладых рэжысёрскіх кадраў наогул вельмі карысна, але ў гэтым выпадку для карысці маладых актораў і тэатра неабходна вылучыць вопытнага рэжысёра.

Наогул акторы-стажоры не могуць пахваліцца чулымі і ўважлівымі адносінамі да сябе дырэкцыі тэатра.

Калі да ўсяго дадаць тое, што атрымліваемая маладымі акторамі зарплата нічым не адрозніваецца ад стыпендыі, якую яны атрымлівалі ў студыі, тады стане зразумелым, чаму людзі, патраціўшыя на гэту справу амаль чатыры гады, пачынаюць думаць аб звароце да старой прафесіі.

С. БУЛЬЧЫК.

ПАТРЭБНА ТВОРЧАЯ ВУЧОБА

18 красавіка маладыя акторы Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР абмяркавалі артыкул тав. Кучара «Няма клопатаў аб маладых акторах» (змешчаны ў газеце «ЛіМ» 10 красавіка).

Маладыя акторы тэатра аднадушна выказалі думку, што артыкул своечасова і правільна ставіць хвалюючыя тэатральную моладзь пытанні.

— За апошні час у нашым тэатры няма творчай вучобы маладых актораў, — гаворыць тав. Сокалаў. — Было некалькі спроб паставіць сіламі моладзі спецыяльны спектакль. Гэтыя спробы вынікаў не далі, бо кіраўніцтва тэатра па-сур'ёзнаму не ставілася да падрыхтоўкі такога спектакля.

Малады актор тав. Смельчакоў гаворыць, што маладыя акторы ў тэатры выкарыстоўваюцца, як правіла, толькі ў якасці дублёраў. Гэта маладых актораў задаволіць не можа. З дублёрамі — маладымі акторамі не працуюць старэйшыя акторы тэатра. Малады актор, які дублірує ролю, павінен выступаць пасля 4—5 рэпетыцый, а гэта, безумоўна, не дае магчымасці яму ўдумліва, самастойна распрацаваць ролю.

Тав. Іваноў заўважае, што раней былі спробы арганізаваць у тэатры творчую вучобу маладых. Але, нажаль, кіраўніцтва тэатра даручала працу з маладымі акторамі не лепшым акторам тэатра, а малакваліфікаваным, выпадковым людзям.

Усе выступаўшыя адзначылі недапусцімасць такога становішча, што ў гэтым годзе з маладымі не праводзіцца ніякай вучобы. Маладых актораў нават не прыцягваюць да абмеркавання ўключаемых у рэпертуар п'ес. Моладзь прадастаўлена сама сабе.

Дырэктар тэатра тав. Траянскі ў сваім выступленні прывёў прыклады таго, як моладзь цалкам апраўдвае сябе пры даручэнні ёй адказных роляў. Малады актор тав. Іваноў з поспехам іграў ролю Паўла Карчагіна ў п'есе «Як гартавалася сталь». Добра справіліся з адказнымі ролямі таварышы Балабанава, Якаўлева, Казачок, Гуляеў і інш. Жаданне моладзі падрыхтаваць сваімі сіламі спектакль у гэтым годзе будзе задаволена.

У сваіх выступленнях маладыя акторы тэатра ўказалі на тое, што мастацкі кіраўнік А. Я. Данэці мала ўдзяляе ўвагі пачынанням моладзі па стварэнню сіламі моладзі спецыяльнага спектакля.

Маладыя акторы патрабуюць ад мастацкага кіраўніцтва і дырэкцыі тэатра неадкладнай арганізацыі належнай творчай вучобы, наладжання дапамогі маладым з боку старэйшых актораў тэатра.

А. Б.

БОЛЬШ ПРАЦАВАЦЬ З ПАЧЫНАЮЧЫМІ

Пытанні, узнятыя А. Кучарам у газеце «Літаратура і Мастацтва» за 10 красавіка, аб маладых акторах, цалкам адносяцца і да работы з пачынаючымі пісьменнікамі.

Мы ў парадку абмеркавання жадаем выказаць нашы погляды на работу з пачынаючымі пісьменнікамі, у асаблівасці з яўрэйскімі.

У Бабруйску, Менску, Нароўлі, Слуцку і іншых гарадах Совецкай Беларусі ёсць даволі здольныя групы пачынаючых пісьменнікаў, якія друкуюць свае творы на старонках раённых і рэспубліканскіх газет. Здавалася-б, што Саюзу совецкіх пісьменнікаў БССР патрэбна было-б пацікавіцца становішчам пачынаючых пісьменнікаў, але гэтага на справе няма.

Возьмем некалькі прыкладаў. Яўрэйская газета «Окцябрь» так «працуе» з пачынаючымі пісьменнікамі. Мы паслалі ў рэдакцыю некалькі вершаў. Праз некаторы час атрымліваем адказ, што вершы ў хуткім часе будуць надрукаваны, і просьбу прыслаць яшчэ некалькі вершаў. Адказ з «Окцябра» нам прыслалі ў лістападзе 1937 года, але і да гэтага часу не ўдасужыліся надрукаваць вершы.

Кроль напісаў п'есу «Патрыёты», паэму аб барацьбе беларускага народа супроць белапольскіх акупантаў і шмат іншых вершаў; Каган таксама напісаў п'есу аб падрыўной рабоце фашысцкіх агентаў у Совецкім Саюзе і зараз піша паэму. Ніякай дапамогі мы не адчуваем. Тое-ж самае можна сказаць і аб пачынаючых пісьменніках Альтэрману, Плоткіну, Квебнаму, Гарэліку, Вальпербу і інш.

Якія прапановы мы хацелі-б унесці для паляпшэння работы з пачынаючымі пісьменнікамі?

Па-першае, трэба ў самым хутчэйшым часе склікаць усебеларускую нараду пачынаючых пісьменнікаў і абмеркаваць пытанні іх далейшай работы; па-другое, выпусціць зборнік твораў пачынаючых пісьменнікаў, прымацаваць да літаратурных гурткоў найбольш моцных пісьменнікаў, якія мелі-б шчыльную сувязь з літгурткамі; арганізаваць у журналах старонкі для пачынаючых пісьменнікаў.

С. КРОЛЬ, М. КАГАН.

Канцэрты філармоніі БССР у Маскве

9 мая канцэртам, які трансліраваўся па радыё, пачаў свае выступленні ў Маскве наш малады творчы калектыў — ансамбль народных песень і плясак Дзяржаўнай філармоніі БССР.

10 мая ў Калоннай зале Дома саюзаў адбыўся першы адкрыты канцэрт для працоўных Масквы. Канцэрт прайшоў з вялікім поспехам. Ансамбль паказаў працоўным Масквы беларускія народныя танцы, выканаў лепшыя творы беларускіх кампазітараў і народныя песні.

12 мая ансамбль выступаў тры разы: раніцой — у студэнтаў Сакольніцкага гарадка, удзень даў канцэрт для дэлегатаў раённай партыйнай канферэнцыі Сакольніцкага раёна і ўвечары — канцэрт у Калоннай зале Дома саюзаў.

13 мая ў памяшканні Цэнтральнага дзіцячага тэатра адбылася сустрэча ансамбля з лепшымі прадстаўнікамі мастацкай грамадскасці сталіцы Совецкага Саюза.

Усе выступленні ансамбля ў Маскве маюць выключны і ўпаўне заслужаны поспех. Асаблівым поспехам карыстаюцца беларускія частушкі аб Сталіне, «Полька-Янка» (у выкананні таленавітай актрысы Аляксеевай), «Ой, у полі ніўка», «Лявоніха» і інш.

Многія выконваемыя ансамблем рэчы, 13 мая былі запісаны на плёнку для спецыяльнага кіно-журнала. Заняты і запісаны, «Рандо» на беларускія тэмы — Самохіна, «Перапёлачка»— Туранкова «Лявоніха», «Жураўелькі», «Полька-Янка», «Купалінька» —муз. Турчанінава. «Ой, рэчанька, рэчанька», «Ой, у полі ніўка», частушкі пра Сталіна, «Жніво», «Лён» і «Бывайце здаровы».

15 мая ансамбль у другі раз выступаў па радыё.

Для начскладу і чырвонаармейцаў Маскоўскага гарнізона 16 мая ансамбль дае спецыяльны канцэрт у адным з клубаў Народнага Камісарыята Абароны.

Свае выступленні ў сталіцы ансамбль заканчвае 18 мая. У гэты дзень ансамбль дасць два канцэрты: у клубе МДУ і ў клубе НКВД.

Выступаючы з вялікім поспехам, абкружаны вялікай увагай і любоўю працоўных сталіцы Совецкага Саюза, наш малады, здольны калектыў—ансамбль філармоніі прадэманстраваў свой творчы рост, роскві мастацтва БССР, шчаслівае жыццё народаў Совецкай Беларусі.

Міх. БЛІСЦІНАЎ.

МАСКВА, 16 мая. Наш кар. (**Па більдапарату**).

УРАЖАННІ З ПРАГЛЯДУ

(Ад нашага спецыяльнага карэспандэнта)

Тры праграмы мастацкай самадзейнасці рабочых запалкава-фанернай прамысловасці, якія мы прагледзелі ў г. Новабеліцы, пакінулі добрае ўражанне.

У самадзейных калектывах пульсуе творчае жыццё. Ёсць таленавітая моладзь, якая вылучаецца своеасаблівай мастацкай індывідуальнасцю. Яна — крыніца папаўнення прафесіянальнага мастацтва свежымі сіламі.

На праглядзе былі паказаны спектаклі «Не так жыві, як хочацца» Астроўскага (Рэчыцкі фанерны завод), «Чэрнь» Шапаваленка (фабрыка «Везувій» — Новабеліца) і канцэртная праграма (Рэчыцкая запалкавая фабрыка).

Спектакль «Не так жыві, як хочацца» у пастаноўцы драмгуртка Рэчыцкага фанернага завода наогул удаўся. Удзельнік гуртка тав. Самончык добра выканала ролю Дар'і. У яе ігры адчуваецца шчырасць і ўнутраная цеплыня. Аднак, некаторыя іншыя выканаўцы падабраны без уліку індывідуальных здольнасцей кожнага.

Ад спектакля «Чэрнь» на тэму аб Парыжскай Комуне засталося больш поўнае ўражанне. Афармленне спектакля дае ўяўленне аб Парыжы 70-х год мінулага стагоддзя. Пераканаўча зроблены касцюмы нацыянальнай гвардыі. Асобныя выканаўцы не дрэнна паказваюць манеру гутаркі і руху французаў. Сярод членаў калектыва асобныя таварышы — Калліннікаў, Юхнаўцова, Горына — бясспрэчна здольныя людзі. Гуртком кіруе граматны рэжысёр і мастак тав. Ленскі.

Канцэртная праграма Рэчыцкага фанернага завода была рознастайнай і цікавай па зместу. Пасля паказу самадзейнымі калектывамі запалкавай фабрыкі тэатралізаванай паэмы А. Жарава «Гармонь» выступілі: струнны аркестр, хор, танцавальныя групы, выканаўцы частушак, дэкламатары вершаў і фізкультурнікі. Найбольш захапляючымі і цікавымі ў праграме былі частушкі на заводскія тэмы, выкананыя стаханаўцамі завода. Рознастайныя здольнасці ў галіне танцаў і спеваў прадэманстравала маладая работніца Іванова. Добрым голасам валодае стаханаўка Гузарэвіч, якая спявала частушкі. З мастацкім густам і мякка выканаў Пратасенка лезгінку. Струнным аркестрам і хорам кіруе рабочы, майстар Папоў. У рэпертуары гэтых калектываў творы Дунаеўскага, Кніпера, Пакрас і народныя песні.

Разам з тым у выкананні паасобных калектываў адчуваецца адсутнасць музычнай граматы, няведанне нот, што значна абядняе мастацкія магчымасці выканаўцаў.

У тэатралізацыі «Гармоні» Жарава выразна адчувалася адсутнасць граматнага мастацкага кіравання рознастайнай і яркай мастацкай самадзейнасцю Рэчыцкай запалкавай фабрыкі.

Дом народнай творчасці БССР і ЦК профсаюза запалкавай прамысловасці павінны арганізаваць падрыхтоўку кіраўнікоў для мастацкай самадзейнасці і забяспечыць самадзейныя калектывы высокамастацкім рэпертуарам.

Міх. МАІСЕЕЎ.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Ул. Галоўлітбела Г—4659